ЯК МАЛАДЗЬ СТАВІЦЦА ДА КАНТРАФАКТУ?
5

ПАДАРУНКІ, УПАКАВАНЫЯ Ў ЛЮБОЎ
9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 МАЯ 2019 г. АЎТОРАК № 92 (28959)

ЛІЧБА ДНЯ

Br2,3 млрд

складзе сёлета фінансаванне Дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу ў Беларусі на 2016—2020 гады. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 3 мая 2019 года № 278. У тым ліку на развіццё раслінаводства ў гэтым годзе накіруюць Br220 млн, жывёлагадоўлі — Br700,9 млн, рыбагаспадарчай дзейнасці — Br621 млн. Для тэхнічнага перааснашчэння і інфарматызацыі аграпрамысловага комплексу прадугледжана Br620 млн, захавання і выкарыстання меліяраваных зямель — Br157 млн. На 2020 год фінансаванне дзяржпраграмы прадугледжана ў аб'ёме Br2,1 млрд. Скарэктаванай дзяржпраграмай прадугледжана павелічэнне да 2020 года аб'ёмаў паставак сельгаспрадукцыі і харчавання на экспарт у вартасным выражэнні да $7 млрд.

КАРАТКА

- **Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі на 1 мая 2019 года склаў 0,3 %.**
- Журналісты 52 краін плануюць асвятляць II Еўрапейскія гульні ў Мінску.
- **Гандбалісты мінскага СКА сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі. У фінале яны перамаглі дзеючага чэмпіёна краіны БГК імя Мяшкова, які выйграваў Кубак апошнія шэсць гадоў, — 30:29.**

- У Брэсцкай вобласці 13—19 мая выпала ад 2,5 да 5 дэкадных нормаў ападкаў.
- **Следчыя высвятляюць абставіны смерці 9-гадовай дзяўчынкі, школьніцы з Турава.**

ISSN 1990 - 763X

Фестывалім!

ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ ГІСТОРЫЯ

На фэсце «Гальшанскі замак» стварылі выдатнае рэканструктарскае свята

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Гэта будзе цікава тым, хто ніколі не блукаў ля падножжа замка. Тым, хто ціхай цёплай парой ніколі не разглядваў верхавіны вежаў і рамантычныя руіны, якія патанаюць у пяшчотным сонцы. Тым, хто думаў, што рыцары існуюць толькі ў казках і ў гістарычных раманах. Або глядзеў на іх праз экран тэлевізара і думаў: «А ці так бывае?» Гэта будзе цікава тым, хто марыў якасна адпачыць ад жыццёвых турбот — таму не паленаваўся і завітаў на фестываль «Гальшанскі замак». Або абавязкова заплануе і завітае ў наступным годзе.
СТАР. 8

Грошы

Нацбанк паказаў абноўленыя 5 і 10 рублёў

Гэтыя банкноты патрапілі ў карыстанне ўчора, мы да іх дакрануліся і паглядзелі на прасвет

Учора ў Цэнтральным сховішчы Нацыянальнага банка адбылася прэзентацыя абноўленых беларускіх банкнот узору 2009 года наміналам 5 і 10 рублёў 2019 года выпуску. Яны ўводзяцца ў абарачэнне з трэцяга панядзелка мая.

У чым жа прычына вырабу гэтых банкнот? Патрэба ў замове грашовай наяўнасці з'явілася таму, што ў папяровых грошай дробнага і сярэдняга наміналу невялікі тэрмін службы. З часам банкноты становяцца патрапанымі, іх неабходна замяняць. «Для Нацбанка важна мець дастатковую колькасць банкнот розных наміналаў у карыстанні. Банкноты 5 і 10 рублёў з'яўляюцца найбольш папулярнымі, яны складаюць каля 40 % ад усіх банкнот, якія знаходзяцца ў абарачэнні.
СТАР. 3

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Класныя навіны

ВЫПУСКНЫ — ГЭТА СВЯТА РАЗВІТАННЯ СА ШКОЛАЙ

Рэспубліканскае свята «Апошні званок» пройдзе сёлета ў Оршы (маладзёжнай сталіцы Беларусі 2019 года) і расцягнецца на два дні. Яго ўдзельнікамі стануць 1700 выпускнікоў 11-х класаў з усёй краіны: па 100 прадстаўнікоў ад пяці абласцей плюс 200 мінчан і тысяча выпускнікоў установ агульнай сярэдняй адукацыі з Віцебшчыны.

Як расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Эдуард ТАМІЛЬЧЫК,** асноўныя ўрачыстыя мерапрыемствы пройдуць на базе Аршанскай дзяржаўнай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2 «Лядовая арэна». Іншагародніх навучэнцаў прывязуць у горад 30 мая ў першай палове дня, размесцяць, пакормяць, а ў 17 гадзін на тэрыторыі, што прылягае да лядовай арэны, распачнецца ўрачыстая частка свята. Узнагароды будуць уручаны 23 найлепшым выпускнікам у намінацыях «Інтэлект», «Талент», «Чэмпіён-2019», «Лідар-2019» і іншых. Гэта будуць пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў і турніраў, творчых конкурсаў і фестываляў. Акрамя таго, падзякай міністра адукацыі будуць адзначаны сем найлепшых класных кіраўнікоў — па адным з кожнай вобласці і Мінска.

Затым моладзь пяройдзе ў лядовую арэну, дзе яе будуць чакаць канцэртная праграма і дыскатэка. Плануецца, што перад выпускнікамі выступяць Іван Вабішчэвіч, гурты NaviBand, «Без білета» і іншыя, а хэдлайнерам вечара стане расійскі выканаўца Аляксей Вараб'ёў. Напрыканцы ўсіх чакае святочны феерверк. На другі дзень запланаваныя аглядная экскурсія па горадзе і ўрачыстае ўскладанне кветак на Аршанскім кургане.
СТАР. 5

ЧАС ДЫПЛАМАТЫІ

Прэзідэнт прыняў даверчыя лісты паслоў 9 краін

Учора ў Палац Незалежнасці прыбылі афіцыйныя прадстаўнікі Беніна, Бразіліі, Данііі, Іспаніі, Емена, Рэспублікі Карэя, Мальты, Славеніі і Уганды, каб перадаць кіраўніку дзяржавы дыпламатычныя дакументы, якія ўручаюцца замежным паслом пры першым прадстаўленні і сведчаць яго прызначэнне.

Без дыскрымінацыі і канфліктаў

Прэзідэнт перакананы, што на беларускай зямлі паслы будуць адчуваць сябе ўпэўнена і ў бяспецы. «Мы па праве ганарымся тым, што ў нас няма расавай дыскрымінацыі, адсутнічаюць разлады і канфлікты на нацыянальнай, рэлігійнай падставе», — дадаў ён.

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што паслам будзе камфортна ажыццяўляць дыпламатычныя функцыі, паколькі асновы нашай знешняй палітыкі — міралюбнасць, шматвектарнасць, узважанасць, паслядоўнасць і прадказальнасць.

І тыя, хто падзяляе гэтыя падыходы, хто прыходзіць да нас з мірам і добрымі намерамі, заўсёды знойдуць у Беларусі разуменне і падтрымку ў рэалізацыі ўсіх канструктыўных планаў і ідэй, рэзюмаваў ён.

На думку кіраўніка дзяржавы, сёння надзвычай запатрабавана канструктыўная роля дыпламатыі і дыпламатаў, якія ўменнем слухаць і чуць, весці перамовы і знаходзіць кампрамісы дапамагаюць пераадолець складанасці і рознагалоссі ў міжнародных адносінах.

«У сучасным свеце, які раздзіраецца супярэчнасцямі, няспыннымі ваеннымі канфліктамі, гандлёвымі войнамі і санкцыямі, экстрэмізмам і нецярпімасцю, іншымі беспрэцэдэнтнымі выклікамі і пагрозамі, Беларусь мэтанакіравана і паслядоўна прасоўвае мірны і ўсёабдымны парадак дня», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што наша краіна шчыра нацэлена на абнаўленне дыялогу па ўмацаванні мер бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўраатлантыцы і Еўразіі. Акрамя таго, мы нацэлены на стварэнне дзейсных механізмаў партнёрства паміж рознымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, фарміраванне спрыяльнага клімату для гандлёвага, эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на падтрымку з боку дзяржаў прысутных паслоў па гэтых і іншых тэмах узаемнага інтарэсу.

Рэзервы супрацоўніцтва

Па словах беларускага лідара, мы вельмі шануем адносіны з кожнай з дзяржаў, чые прадстаўнікі ўчора знаходзіліся ў Палацы Незалежнасці.

Паводле яго слоў, Данія — перспектыўны партнёр для Беларусі, з якім мы маем намер развіваць больш прадуктыўнае супрацоўніцтва. Агульная для нашых краін задача — падтрымка міру і стабільнасці ў Еўрапейскім рэгіёне. Беларусі важны дыялог з дацкім бокам па гэтым і іншых пытаннях двухбаковага парадку дня, а таксама развіццё кантактаў у галіне гандлю, інвестыцый і энергаэфектыўнасці.

Наша краіна таксама надае вялікае значэнне ўмацаванню супрацоўніцтва з Іспаніяй. «Гэта пацвярджае прызначэнне ў лютым гэтага года першага пасла Беларусі ў Мадрыдзе», — нагадаў Прэзідэнт і выказаў упэўненасць, што аналагічныя крокі з іспанскага боку па адкрыцці паўнавартаснага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Мінску ўмацавалі б адносіны паміж нашымі краінамі.

«Мы здольныя прыкметна прасунуцца ў нашым узаемадзеянні з Мальтай, якая, з'яўляючыся адносна невялікай па тэрыторыі, колькасці насельніцтва дзяржавай, выконвае вельмі важную ролю ў Еўрапейскім саюзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, за апошнія гады нашай краіне ўдалося стварыць салідную базу для развіцця і пашырэння ўзаемнага супрацоўніцтва, сувязяў са Славеніяй, якая неаднаразова на справе даказвала, што з'яўляецца вялікім сябрам Беларусі. «Мы ўдзячныя вашай краіне за падтрымку нашага імкнення да нармалізацыі адносін з Еўрасаюзам. Стабільна інтэнсіўны і эфектыўны характар носяць кантакты беларускіх і славенскіх бізнесменаў. Нашы дзелавыя колы гатовыя да новых сумесных праектаў у энергетыцы, фармацэўтыцы, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве і іншых сферах», — дадаў ён.

«Адным з прыярытэтаў Беларусі ў Лацінаамерыканскім рэгіёне застаецца развіццё супрацоўніцтва з Бразіліяй. У фокусе двухбаковых адносін — умацаванне палітычнага дыялогу, нарошчванне тавараабароту, стварэнне сумесных вытворчасцяў, — сказаў Прэзідэнт. — Разлічваем, што праца пасла будзе садзейнічаць выведу беларуска-бразільскіх адносін на якасна новы ўзровень, які адпавядае патэнцыялу нашых краін».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Емен традыцыйна ўваходзіў у лік асноўных партнёраў Беларусі ў арабскім свеце. Ён са шкадаваннем адзначыў, што кантакты паміж нашымі краінамі былі замарожаныя з прычыны рэзкага пагаршэння ваенна-палітычнай сітуацыі ў Емене. «У справе хутчэйшага аднаўлення краіны, вяртання яе да мірнага рытму жыцця Беларусь гатова дапамагаць, забяспечыўшы пастаўкі ўсяго таго, што вырабляецца ў нашай краіне», — дадаў беларускі лідар.

Беларусь адкрыта для далейшага паглыблення ўзаемавыгадных сувязяў з Рэспублікай Карэя, асабліва ў інавацыйных сферах. Аляксандр Лукашэнка запрасіў карэйскіх інвестараў для рэалізацыі высокатэхналагічных рашэнняў у Беларусі і ўмацавання супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і турызму.

«У рэгіёне Заходняй Афрыкі разглядаем Бенін у якасці перспектыўнага гандлёва-эканамічнага партнёра. Інтарэсам нашых краін адпавядае больш інтэнсіўнае развіццё супрацоўніцтва і забеспячэнне стабільнага росту эканомікі», — сказаў ён.

Беларусь гатовая прапанаваць Беніну шырокую гаму тэхнікі, спажывецкіх тавараў і харчавання, адукацыйныя паслугі. Прэзідэнт дадаў, што мы чакаем ад бенінскага боку сустрэчных ініцыятыў для сумеснай рэалізацыі.

«Пацвярджаем нашу цікавасць да развіцця ўзаемадзеяння з Угандай. Бачым перспектывы ў наладжванні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, у першую чаргу ў галіне паставак беларускай складанатэхнічнай прадукцыі, якая добра зарэкамендавала сябе на афрыканскім рынку, а таксама стварэння сумесных вытворчасцяў у вашай краіне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Беларусь разлічвае на садзейнічанне новага пасла ў рэалізацыі праектаў у іншых сферах узаемнай цікавасці, у прыватнасці па падрыхтоўцы ў Беларусі кваліфікаваных кадраў для Уганды, супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, абароны, культуры.

«Разлічваем, што пры вашым актыўным і прафесійным ўдзеле гэта супрацоўніцтва будзе мацнець і дынамічна развівацца, напаўняцца новымі якасцю і зместам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Партнёры

НОВЫ ЭТАП У ГІСТОРЫІ

Аляксандр Лукашэнка 29 мая прыме ўдзел у саміце ЕАЭС у Нур-Султане

А ў другой палове года Прэзідэнта чакаюць у Казахстане з афіцыйным візітам. Аб гэтым падчас размовы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры заявіў Ермухамет Ертысбаеў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі. Мерапрыемства было прысвечана пазачарговым выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан, якія адбудуцца 9 чэрвеня гэтага года.

Адстаўка 19 сакавіка 2019 года першага кіраўніка краіны Нурсултана Назарбаева стала выключнай падзеяй не толькі для сусветнай супольнасці, але і для палітычных дзеячаў Казахстана. Першы прэзідэнт Казахстана вызначыў і свайго пераемніка Касыма-Жамарта Такаева. Сімвалічна, што яго апошні да назначэння афіцыйны візіт на пасадзе старшыні сената быў у Беларусь, дзе ён сустракаўся з нашым Прэзідэнтам і парламентарыямі.

«Трэба зняць любую нявызначанасць», — з такім пасылам прэзідэнт Такаеў аб'явіў будучыя выбары. Чарговае галасаванне павінна было адбыцца ў красавіку 2020 года, але палітычныя эліты разумелі, што з меркаванняў легітымнасці і народнай падтрымкі кіраўніка дзяржавы патрэбна ранейшая электаральная кампанія. «Прычым выбары павінны быць канкурэнтнымі, справядлівымі, свабоднымі і альтэрнатыўнымі», — пракаментаваў пасол.

Касым-Жамарт Такаеў настроены на захаванне пераемнасці стратэгічнага курсу Нурсултана Назарбаева. «А стратэгічны курс Нурсултана Абішавіча быў такі — увайсці ў сярэдзіне стагоддзя ў 30 самых развітых краін свету», — адзначыў пасол Казахстана і дадаў, што не сумняваецца ў перамозе дзеючага кіраўніка дзяржавы.

У якасці кандыдатаў на найвышэйшую дзяржаўную пасаду зарэгістраваныя сем чалавек. Сур'ёзным гульцом кампаніі, на думку пасла, з'яўляецца Аміржан Касанаў, кіраўнік апазіцыйнай партыі «Лёс нацыі». Упершыню ў гісторыі краіны балатуецца на прэзідэнцтва жанчына — Данія Еспаева ад партыі «Светлы шлях».

«Прэзідэнцкая выбарчая кампанія, якая цяпер праходзіць у Казахстане, толькі на першы погляд можа здацца вельмі простай для ўлады», — сказаў Ермухамет Ертысбаеў.

Адказваючы на пытанне журналістаў наконт змены курсу еўразійскага супрацоўніцтва будучым прэзідэнтам, пасол адзначыў, што ў Казахстане не было, няма і не будзе альтэрнатывы еўразійскай інтэграцыі: «Мы ішлі і будзем ісці па гэтым шляху. Мы будзем пашыраць, выводзіць на новы якасны ўзровень Еўразійскі эканамічны саюз. Ён будзе прывабным не толькі для былых рэспублік Савецкага Саюза. Я ўпэўнены, што XXI стагоддзе — стагоддзе інтэграцыі». Пры гэтым захаваецца станоўчая дынаміка і двухбаковых адносін Беларусі і Казахстана, тавараабарот паміж якімі ўжо дасягнуў амаль мільярда долараў.

Сачыць за выбарамі ў Казахстане будуць звыш 700 наглядальнікаў, з іх 350 ад АБСЕ. 9 чэрвеня выбарчы ўчастак з 7.00 да 20.00 будзе працаваць у пасольстве ў Мінску. Пасля галасавання ЦВК Казахстана мае сем дзён для вызначэння, апублікавання і рэгістрацыі выбранага прэзідэнта.

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

ІДЭІ ШУКАЮЦЬ ПАДТРЫМКУ

20 мая старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка прыняў удзел у пасяджэнні Савета Парламенцкай Асамблеі АДКБ у Бішкеку (Кыргызская Рэспубліка), паведамляе прэс-служба ніжняй палаты беларускага парламента.

У пасяджэнні ўдзельнічалі дэлегацыі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. У якасці назіральнікаў прысутнічалі прадстаўнікі Сербіі.

Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі прыярытэты старшынства Кыргызскай Рэспублікі ў АДКБ у 2019 годзе, вынікі дзейнасці Пастаяннага савета АДКБ па ўдасканаленні інстытуцыйных асноў Арганізацыі, актуальныя пытанні процідзеяння выклікам і пагрозам калектыўнай бяспекі, гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ на 2016 — 2020 гады, узаемадзеяння парламенцкіх дэлегацый краін АДКБ у Парламенцкай асамблеі АБСЕ, арганізацыю працы групы міжнародных назіральнікаў ПА АДКБ па назіранні за пазачарговымі выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан. Акрамя таго, быў удакладнены план работы ПА АДКБ на 2019 год.

Уладзімір Андрэйчанка праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб выніках Міжнароднай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ «Адзін пояс, адзін шлях: паглыбленне супрацоўніцтва ў імя ўстойлівага развіцця і росквіту», якое адбылося 29—30 красавіка ў Мінску.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама расказаў аб асноўных выніках дзейнасці беларускай парламенцкай дэлегацыі ў ПА АБСЕ. У прыватнасці, ён адзначыў, што па ініцыятыве беларускага боку пры актыўнай падтрымцы дзяржаў — членаў АДКБ Парламенцкай асамблеяй АБСЕ быў прыняты шэраг рэзалюцый па такіх важных пытаннях, як супрацоўніцтва ў пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, барацьба з гандлем людзьмі і распаўсюджваннем наркотыкаў, прасоўванне зялёнай і лічбавай эканомікі ў інтарэсах забеспячэння эканамічнага росту на прасторы АБСЕ.

Уладзімір Андрэйчанка таксама паведаміў пра праект чарговай беларускай рэзалюцыі «Стратэгічнае прагназаванне ў галінах навукі, тэхналогій і інавацый для ўстойлівага развіцця», якая падрыхтавана да летняй сесіі ПА АБСЕ. Зараз праект праходзіць працэдуру збору подпісаў для ўнясення ў якасці дадатковага пункта ў парадак дня сесіі Арганізацыі, якая адбудзецца ў ліпені 2019 года ў Люксембургу. Беларускі парламентарый выказаў надзею на цеснае супрацоўніцтва калег з краін АДКБ у прыняцці рэзалюцыі.

Прапановы беларускага боку былі аднагалосна падтрыманы ўдзельнікамі пасяджэння.

* * *

Напярэдадні, 19 мая, Уладзімір Андрэйчанка правёў у Бішкеку двухбаковыя сустрэчы са сваімі кыргызскім і казахскім калегамі. Падчас сустрэчы са спікерам парламента Кыргызскай Рэспублікі Дастанбекам Джумабекавым старшыня Палаты прадстаўнікоў прапанаваў надаць больш сур'ёзную ўвагу развіццю ўзаемадзеяння ў сферах адукацыі, медыцыны і па іншых кірунках, не менш цікавых за гандлёва-эканамічны. Датычна эканомікі кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента адзначыў важнасць пашырэння не толькі гандлю, але і вытворчай кааперацыі з мэтай выхаду на рынкі трэціх краін, перш за ўсё ўдзельніц ЕАЭС.

У ходзе сустрэчы са старшынёй Мажыліса (ніжняй палаты) парламента Рэспублікі Казахстан Нурланам Нігматуліным былі адзначаны інтэнсіўны дыялог, цесныя і даверныя адносіны, якія развіваюцца паміж дзвюма дзяржавамі і іх парламентамі. Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі, што асаблівая заслуга ў дасягненні высокага ўзроўню двухбаковага супрацоўніцтва належыць прэзідэнтам дзвюх дзяржаў.

Па выніках сустрэчы Нурлан Нігматулін выказаў упэўненасць у тым, што пастаўленая прэзідэнтамі дзвюх краін задача выхаду на тавараабарот у адзін мільярд долараў цалкам выканальная. Паводле яго слоў, парламент Казахстана будзе аказваць усё неабходнае садзейнічанне вырашэнню гэтай і іншых актуальных задач развіцця двухбаковага супрацоўніцтва з брацкай Беларуссю.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

КАНТРАКТЫ НА 200 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

MILEX 2019 па маштабе перасягнула ўсе папярэднія выстаўкі. Пра гэта ў інтэрв'ю тэлеканалу АНТ заявіў старшыня Дзяржкамваенпрама Раман Галоўчанка, паведамляе БелТА.

«У першую чаргу з пункту гледжання колькасці ўзораў новай тэхнікі, узбраення, якія прадстаўлены беларускай абароннай прамысловасцю, — адзначыў Раман Галоўчанка. — Калі параўнаць па колькасці ўзораў выстаўку, якая была два гады таму, і цяперашнюю, яны адрозніваюцца кардынальна. Гэта з'яўляецца доказам якаснага скачка».

Усяго на выстаўцы заключана каля 30 знешнеэканамічных дагавораў у сферы ўзбраення і ваенна-тэхнічнай маёмасці на суму каля $200 млн. Па словах старшыні Дзяржкамваенпрама, многія госці выстаўкі не чакалі, што змогуць убачыць настолькі маштабнае відовішча. Найбольшую цікавасць у наведвальнікаў выклікала экспазіцыя беларускага стралковага ўзбраення. Адным з галоўных сюрпрызаў выстаўкі была дэманстрацыя новых узораў беларускага ракетнага ўзбраення. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб створаным у сістэме Дзяржкамваенпрама ЗРК «Бук». «Са з'яўленнем гэтага вырабу, новых малавышынных радыёлакацыйных станцый фактычна можна казаць пра стварэнне завершанай нацыянальнай сістэмы СПА Беларусі ўласнай вытворчасці», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Яшчэ на выстаўцы ўпершыню быў прадстаўлены цэлы шэраг машын, у тым ліку дыстанцыйна кіраваных баявых модуляў. Свае распрацоўкі прадставілі таксама прадпрыемствы, якія вырабляюць прадукты, тэхналогіі па абароне інфармацыі, кібербяспекі.

Нацбанк паказаў абноўленыя 5 і 10 рублёў

Фота Андрэя САЗОНАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яны актыўна выкарыстоўваюцца як нашымі людзьмі, так і арганізацыямі гандлю і сэрвісу. Пры гэтым пастаянна павялічваецца доля старых банкнот гэтага наміналу», — адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення наяўнага грашовага абарачэння Нацыянальнага банка краіны Сяргей ГАЙКО.**

Але хвалявацца няма прычыны. Глабальных змяненняў у малюнку і графіцы няма. Ад старых новыя банкноты будуць адрознівацца толькі некаторымі нюансамі. Напрыклад, выключаны рэквізіт «Старшыня Праўлення» і факсіміле подпісу, прыведзены ў адпаведнасць з актуальным знешнім выглядам выявы архітэктурных збудаванняў на вонкавых баках банкнот і пазначаны іх назвы. Нагадаем, на банкноце ў пяць рублёў намаляваная Камянецкая вежа, на 10-рублёўцы — Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку. А замест «2009» паказаны іншы год увядзення ў абарачэнне — «2019».

Фінансавы рэгулятар таксама папярэджвае: старыя купюры 2009 года выпуску працягваюць заставацца законным плацежным сродкам. Бегчы ў касы банкаў і мяняць іх на новыя няма ніякай патрэбы.

Зараз аб абноўленых банкнотах больш падрабязна.

«На банкноце ў 5 рублёў раней быў паўтонавы вадзяны знак, цяпер дадалі яшчэ і філігранны вадзяны знак. Камбінацыя вадзяных знакаў, паўтоннага і філіграннага, — вельмі моцная абарона ад падробкі», — удакладняюць у Нацыянальным банку краіны. Там, дзе вадзяны знак відаць на прасвет, цяпер відавочна бачны светлы ўчастак у выглядзе пяцёркі або дзясяткі. Дарэчы, гэты вадзяны знак лёгка вызначаецца навобмацак. Ахоўная нітка на банкноце знаходзіцца ў ранейшым месцы, але яна стала шырэйшай.

Беларускія банкноты друкавалі на фабрыцы «Дзяржзнака» ў Пензе.

Расійская фабрыка таксама будзе друкаваць банкноты наміналам 20 і 50 рублёў. Іх выпуск у абарачэнне запланаваны на 2020 год. Гэтая ж фабрыка цяпер чакаюць манеты для Беларусі, — расійскае прадпрыемства выйграла абодва тэндары.

Манеты дробных наміналаў, перш за ўсё 1 і 2 капейкі, з'яўляюцца самымі запатрабаванымі і не вяртаюцца ў касы Нацыянальнага банка. Пры гэтым іх выдача з кас Нацыянальнага банка пастаянна расце.

Дадатковы выраб наяўных грошай не азначае павелічэння грашовай масы, паколькі іх выпуск у абарачэнне прыводзіць да пераходу грашовых сродкаў з безнаяўнай формы ў наяўную, бо банкі за атрыманыя грашовыя знакі пералічваюць Нацыянальнаму банку іх безнаяўны эквівалент.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кіеве адбылася інаўгурацыя Уладзіміра Зяленскага

Учора ў Вярхоўнай Радзе прайшла ўрачыстая цырымонія інаўгурацыі новаабранага шостага прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага.

У зале прысутнічалі ўсе члены ўрада і чатыры экс-прэзідэнты Украіны: Леанід Краўчук, Леанід Кучма, Віктар Юшчанка і Пётр Парашэнка. Таксама на цырымонію прыехалі прэзідэнты Грузіі Саламэ Зурабішвілі, Эстоніі Керсці Кальюлайд, Літвы Даля Грыбаўскайтэ, Венгрыі Янаш Адэр. У пачатку цырымоніі прагучаў гімн Украіны, а кіраўнік ЦВК зачытала вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Пасля гэтага Уладзімір Зяленскі зачытаў тэкст прысягі, паклаўшы адну руку на Канстытуцыю, а другую — на Перасопніцкае Евангелле. Кіраўнік ЦВК уручыла Зяленскаму пасведчанне прэзідэнта Украіны, а старшыня Канстытуцыйнага Суда — сімвалы прэзідэнцкай улады: булаву, пячатку і нагрудны знак.

Потым абраны прэзідэнт выступіў са зваротам да ўкраінскага народа. Зяленскі аб'явіў аб роспуску Вярхоўнай Рады 8-га склікання. У Марыінскім парку каля Вярхоўнай Рады былі ўсталяваны вялікія экраны, і ўсе ахвотныя, а іх сабралася шмат, маглі назіраць прамую трансляцыю цырымоніі.

Ад Беларусі на інаўгурацыі прысутнічаў віцэ-прэм'ер Ігар Ляшэнка.

Ангела Меркель пакіне палітыку пасля 2021 года

Ангела Меркель пацвердзіла, што не будзе займаць якія-небудзь палітычныя пасады пасля таго, як у 2021 годзе скончыцца яе чацвёрты тэрмін у якасці канцлера Германіі. Пра гэта яна заявіла на сумеснай прэс-канферэнцыі з прэм'ер-міністрам Нідэрландаў Маркам Рутэ, піша Reuters.

Па словах Ангелы Меркель, планы, якія яна абвясціла ў канцы мінулага года, актуальныя. У канцы 2018 года яна пайшла з пасады старшыні Хрысціянска-дэмакратычнага саюза, але засталася канцлерам, паведаміўшы, што збіраецца дапрацаваць чацвёрты тэрмін да канца — да 2021 года, а затым пайсці з палітыкі.

Ангела Меркель таксама абвергла меркаванні пра тое, што пасля заканчэння дзеючага канцлерскага тэрміну можа заняць высокую пасаду ў структуры Еўрапейскага саюза ў Бруселі. «Я не збіраюся займаць палітычныя пасады дзе б там ні было», — сказала яна.

Як піша ТАСС, спекуляцыі аб тым, што Ангела Меркель зойме пасаду ў структуры Еўрапейскага саюза, пачаліся пасля апублікаванага 16 мая інтэрв'ю нямецкай газеце Suddeutsche Zeitung. У ім канцлер заявіла, што мае пачуццё адказнасці за лёс Еўропы, якое ўзмацняецца. Назіральнікі трактавалі гэтыя выказванні як намёк на змену яе палітычнага профілю і хуткі пераезд у Брусель.

Сусветныя інтэрнэт-гіганты падпісалі пагадненне па барацьбе з экстрэмізмам у сеціве

Сусветныя інтэрнэт-гіганты, у тым ліку Facebook, Twitter, Google, YouTube, Amazon, Microsoft, падпісалі ў Парыжы пагадненне аб супрацоўніцтве, у якім абавязаліся прыняць меры па барацьбе з экстрэмізмам у сеціве. Пра гэта паведамляе нямецкая тэлерадыёкампанія Deutsche Welle.

На сустрэчы ў Елісейскім палацы найбуйнейшыя інтэрнэт-канцэрны падтрымалі так званы крайстчэрчскі заклік, мэта якога — пазбегнуць паўтарэння трагедыі, падобнай да тэракта ў новазеландскім Крайстчэрчы.

У «крайстчэрчскім закліку» выказваецца намер «прыняць празрыстыя і мэтанакіраваныя меры, каб прадухіліць загрузку тэрарыстычнага і заклікаючага да гвалту экстрэмісцкага кантэнту».

У апублікаваным па выніках сустрэчы камюніке гаворыцца, у прыватнасці, пра неабходнасць распрацаваць інструменты, каб прадухіліць загрузку тэрарыстычнага кантэнту, павысіць эфектыўнасць яго выяўлення і выдалення, а таксама паглыбіць супрацоўніцтва з праваахоўнымі органамі для вырашэння гэтай праблемы.

Надвор'е

Цяпло з пераменным поспехам

Калі ў аўторак і сераду сонечна і цёпла, то ў чацвер і пятніцу — дажджы і пахаладае

У краіне чакаецца няўстойлівае надвор'е. У пачатку тыдня ўмовы надвор'я будзе вызначаць цёплая паветраная маса, а ў паўднёва-заходняй частцы краіны адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў. Пад канец тыдня стане крыху халадней, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Раніцай і ўначы месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў, удзень — 18-24 цяпла, месцамі паветра прагрэецца да плюс 26 градусаў. Затым нас чакае чарада дажджоў. У чацвер уначы ў асобных раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. У начныя і ранішнія гадзіны дзе-нідзе згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 9-15 цяпла, удзень — ад плюс 19 да плюс 26 градусаў. Ападкі будуць і ў пятніцу — на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 8 да 15 цяпла, удзень — 15—22 градусаў вышэй за нуль, толькі на паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да плюс 24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Гучная справа

СК АБ СМЕРЦІ ІНСПЕКТАРА ДАІ: АСНОЎНАЯ ВЕРСІЯ — СУІЦЫД

Увечары 16 мая краіну скалыхнула вестка аб жудасным злачынстве. У лесе ў Магілёўскім раёне было знойдзена цела забітага 22-гадовага інспектара ДАІ Яўгена Патаповіча. З'явілася інфармацыя пра тое, што незадоўга да гібелі лейтэнант адправіўся на расследаванне дарожна-транспартнага злачынства. Неўзабаве з яго нумара паступіла паведамленне на Viber пра аўтамабіль маркі «Волга» з расійскімі нумарамі.

Афіцэра пахавалі ў суботу. Але дагэтуль у справе, ход расследавання якой кантралюе асабіста кіраўнік Следчага камітэта, засталося шмат нявысветленых пытанняў. Сёння над імі крыху прыўзнялі заслону.

— Вялікую складанасць у разуменні таго, што адбылося, ствараліінфармацыйныя ўкіды, якія суправаджалі гэтую сітуацыю на працягу першапачатковых следчых дзеянняў. Гэта шмат каго ўводзіла ў зман, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі Юлія ГАНЧАРОВА.**

— Адпрацоўваліся розныя версіі здарэння, — расказаў **начальнік галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта Яўген АРХІРЭЕЎ.** — Правяраліся абставіны службовай дзейнасці супрацоўніка міліцыі, яго асабістае жыццё, апошнія стасункі. Інфармацыя аб магчымым выкраданні афіцэра з выкарыстаннем чорнай «Волгі» не пацвердзілася.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў Максім СВІРЫД зазначыў, што на запісах камер вонкавага відэаназірання, устаноўленых на вуліцах Першамайскай і Крупскай у Магілёве, з 18 да 21 гадзіны 16 мая ніякай чорнай «Волгі» не было.

— Аналіз сабранай інфармацыі дазваляе казаць, што асноўная версія таго, што здарылася, — суіцыд, — сказаў Яўген Архірэеў. — Следства высветліла ўсе дзеянні Яўгена Патаповіча ў дзень яго гібелі да 18 гадзін, калі ён дабраўся на спадарожным аўтамабілі да чыгуначнага пераезда ў раёне вуліц Першамайскай і Вакзальнай. Трэба сказаць, што ён самастойна прыняў рашэнне паехаць у гэтае месца, праігнараваўшы ўказанне аператыўнага дзяжурнага адправіцца на афармленне ДТЗ, якое здарылася на Арлоўскім завулку.

Падчас агляду месца злачынства быў знойдзены пісталет афіцэра, два магазіны, яго асабістыя рэчы. Таксама ў гэты спіс трапілі... тры пакункі дроў, вадкасць для распалу, дакументы і іншыя асабістыя рэчы.

Па даных следства, іх Яўген Патаповіч набыў каля 11 гадзін у адным з гандлёвых пунктаў абласнога цэнтра.

— На целе загінулага няма ніякіх пашкоджанняў, акрамя кулявога ранення, — працягнуў Яўген Архірэеў.

У сваю чаргу, Максім Свірыд спыніўся на дэталізацыі даных з тэлефона загінулага інспектара. 16 мая з 11 да 13 гадзін ён быў на месцы, дзе пазней было знойдзена цела. Супрацоўнікі ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій вывучылі ноўтбук Яўгена Патаповіча. Аказалася, што 1 красавіка ён падрыхтаваў і накіраваў шэраг паведамленняў з тэкстам суіцыдальнай скіраванасці. Акрамя таго, следства мае даныя пра тое, што афіцэр меў намер забіць сябе ў красавіку.

Зараз аператыўнікі шукаюць кіроўцу аўтамабіля, які мог давезці ўвечары 16 мая Яўгена Патаповіча фактычна да месца здарэння.

Расследаванне справы працягваецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне намесніку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Пірштуку Баляславу Казіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Супрацоўнікі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказваюць глыбокае спачуванне намесніку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Пірштуку Баляславу Казіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю МАЦІ.

ДА СУСТРЭЧЫ Ў АМСТЭРДАМЕ!

Нідэрланды выйгралі песенны конкурс упершыню за апошнія 44 гады

Фота БелТА.

Мінулыя выхадныя адзначыліся вырашэннем інтрыгі чарговага, 64-га па ліку, міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне». Калі пераказваць вынікі вельмі сцісла, то букмекеры зноў мелі рацыю: у пяты раз за гісторыю конкурсу перамогу атрымаў прадстаўнік Нідэрландаў.

Беларусь жа не абышлася без скандалу, у эпіцэнтры якога аказалася нават не артыстка, а... журы. Рэч у тым, што арганізатары дысквалiфікавалі беларускае нацыянальнае журы літаральна за некалькі гадзін да фіналу, а ўжо выстаўленыя ацэнкі скасавалі і замянілі на спецыяльна прадугледжаныя для форс-мажорных сітуацый «сукупныя балы з рэзервовага кошыка». Адбылося гэта, як афіцыйна патлумачыла прэс-служба «Еўрабачання», праз парушэнне правілаў конкурсу — беларускія суддзі ў інтэрв'ю аднаму з айчынных парталаў расказалі пра свае перавагі на паўфінальным этапе (а паводле рэгламенту раскрываць гэтыя звесткі нельга да фіналу, каб не паўплываць на галасаванне іншых краін).

«Разынкамі» фінальнага галаканцэрта сталі своеасаблівая пераклічка ўдзельнікаў «Еўрабачання» мінулых гадоў: Монса Зелмерлёў са Швецыі, Веркі Сярдзючкі з Украіны, Элені Фурэйра з Кіпра і Канчыты Вурст з Аўстрыі, якія спявалі песні адно аднаго, а таксама выступленне першай ізраільскай пераможцы Галі Атары, чыя Hallelujah з 1979 года, здаецца, нікольки не састарэла. Спецыяльным госцем шоу стала таксама Мадонна, басналоўны ганарар якой заплаціў ізраільска-канадскі мільярдэр; аднак спевы міма нот выклікалі ў прысутных хіба радасць, што гэта не іхнія грошы пайшлі на аплату амерыканскай поп-дзівы...

Як бы ні ставіліся гледачы да «Еўрабачання», трэба аддаць арганізатарам шоу належнае: яно застаецца цікавым дзякуючы сваёй непрадказальнасці. Нават калі ты на 100 % упэўнены, што ведаеш вынікі, драматургія абвяшчэння галасоў зладжана такім чынам, што ўсе да апошняга імгнення нервуюцца і сумняюцца. Вось і сёлета больш як 200-мільённая тэлеаўдыторыя з усяго свету назірала тую самую сітуацыю: фаварыты ў журы, Паўночная Македонія, былі даволі нізка ацэнены гледачамі, а ўлюбёнцы публікі, Нарвегія, не выклікалі захаплення ў прафесіяналаў.

Пераможная песня Дунгана Лоўрэнса «Arcade» набрала ў суме 492 балы — 231 ад журы і 261 ад гледачоў. (Хоць магла быць наогул не дапушчана да конкурсу, бо першая публікацыя яе на YouTube адбылася яшчэ ў 2017-м і такім чынам парушала правілы. Але спецыяльная рэферэнтная камісія Еўрапейскага вяшчальнага саюза, разбіраючы сітуацыю, прыйшла да высновы, што гэта не камерцыйнае абнародаванне і яно не прынесла выканаўцу ніякіх пераваг.) «Стоячы на сцэне ўжо ў якасці пераможцы, я адчуваў сябе, нібы ў радку з песні, хлопчыкам з маленькага гарадка ў вялікай аркадзе, — сказаў Дункан Лоўрэнс на прэс-канферэнцыі. Ён адзначыў, што напісаў сваю першую песню ўсяго год таму і нават марыць не мог, што выйграе «Еўрабачанне», і перамога — гэта не толькі шанцаванне, але яшчэ «вынік цяжкай працы ўсёй каманды».

Другую прыступку заняў прадстаўнік Італіі Махмуд з 465 баламі. Расіянін Сяргей Лазараў, які набраў 369 балаў, паўтарыў уласны вынік 2016 года і аказаўся на трэцім месцы.

Беларусь па выніках галасавання журы і гледачоў з 31 балам трапіла ў фінале на перадапошняе, 25-е месца (ніжэй за нас была толькі Вялікабрытанія). Нашу артыстку ўхваліла журы з Расіі (8 балаў) і Азербайджана (5 балаў) і гледачы Венгрыі (8 балаў), Расіі (7 балаў), Эстоніі, Азербайджана і Арменіі (па 1 бале). Дарэчы, і ў паўфінале наша ЗЕНА, як высветлілася, ускочыла на падножку апошняга вагона на 10-й пазіцыі, усяго на 2 балы абагнаўшы Польшчу. У сваю чаргу, Беларусь паставіла ў паўфінале 12 балаў Ісландыі (гледачы) і Эстоніі (журы), а ў фінале — Ізраілю (ацэнка з «рэзервовага кошыка» замест балаў журы) і Расіі (гледачы). Таксама ў фінальным канцэрце беларускія гледачы ўпадабалі выступленні Нідэрландаў, якім паставілі 10 балаў, Нарвегіі — 8, Ісландыі — 7, Азербайджана — 6, Славеніі — 5, Швейцарыі — 4, Італіі — 3, Аўстраліі — 2 і Сан-Марына — 1.

Такім чынам, планка, узнятая Дзмітрыем Калдуном у 2007 годзе — 6-е месца ў фінале, — засталася найлепшым дасягненнем нашай краіны на конкурсе. За ЗЕНУ, якая ў 16-гадовым узросце спраўдзіла мару выступіць на «Еўрабачанні», можна толькі парадавацца: шоу такога ўзроўню — гэта каласальны вопыт і штуршок для развіцця. А ў цэлым адчуванні змешаныя: з аднаго боку, перадапошняе месца — не поспех, з другога, удзел 16 гадоў у конкурсе — не тэрмін. Можна, вядома, сэканоміць грошы і нервы, узяць ды адмовіцца ад удзелу. Але ж гэта нейкая дзіцячая крыўда «не буду з вамі гуляць, калі вы такія». Шоу ўсё адно будзе працягвацца — з намі ці без нас.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Дарэчы

Акрамя Беларусі, ніколі не станавіліся пераможцамі «Еўрабачання» Паўночная Македонія (удзельнічае з 1996 года, найлепшы вынік — сёлета 8-е месца ў фінале), Грузія (з 2007 года, найлепшы вынік — 9-я ў фінале), Сан-Марына (з 2008 года, дабіралася максімум да 20-га месца ў фінале), Славенія (з 1993 года, найлепшы вынік — 7-я ў фінале), Літва (з 1994 года, займала максімум 6-е месца) і яшчэ добрых паўтара дзясятка краін.



ВЫПУСКНЫ — ГЭТА СВЯТА РАЗВІТАННЯ СА ШКОЛАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Эдуард Тамільчык падкрэсліў, што ўжо сёння на асаблівы кантроль узяты пытанні бяспекі як падчас свята, так і ў месцах пражывання, харчавання маладых людзей, іх санітарная і медыцынская бяспека.

Вучэбны год для ўсіх школьнікаў завяршаецца 31 мая. Базавую школу сёлета заканчваюць 85,6 тысячы навучэнцаў (на 600 чалавек больш у параўнанні з папярэднім годам), а сярэднюю школу — 55,4 тысячы навучэнцаў (на 2,9 тысячы менш).

1 чэрвеня ў навучальных установах стартуюць выпускныя іспыты. Навучэнцы 11-х класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (на выбар) і матэматыцы пройдуць 1, 3 і 5 чэрвеня. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, таксама іх размесцяць на партале Міністэрства адукацыі. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць вусны экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

Пасля заканчэння базавай школы вучні здаюць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку пісьмова. У 9-м класе пісьмовыя экзамены пройдуць 4, 6 і 8 чэрвеня.

— Пры складанні экзаменацыйнага раскладу павінны ўлічвацца санітарныя нормы і правілы. Перапынак паміж экзаменамі — не менш за адзін дзень, — тлумачыць **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.** — Для выпускнікоў базавай школы на выкананне пісьмовай работы па беларускай і рускай мовах адводзіцца адна астранамічная гадзіна і чатыры астранамічныя гадзіны — для напісання матэматыкі. Адзінаццацікласнікі пішуць пераказ па мове чатыры астранамічныя гадзіны, а на матэматыку ім даецца на гадзіну больш. Для падрыхтоўкі да вуснага адказу выпускнікам адводзіцца не больш за 30 хвілін.

Выпускныя вечары Міністэрства адукацыі рэкамендавала правесці ў школах 8 і 9 чэрвеня. Рашэнне аб даце і месцы іх правядзення, працягласці па часе прымаюць кіраўнікі ўстаноў адукацыі сумесна з бацькоўскімі камітэтамі і ўзгадняюць з мясцовымі органамі ўлады. Толькі ў асобных выпадках выпускны можа прайсці ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ці ўстанове культуры. Такая сітуацыя магчымая, калі, напрыклад, у школе старой пабудовы няма актавай залы або колькасць выпускнікоў перавышае колькасць месцаў у ёй. Варыянты з рэстаранамі, кавярнямі і начнымі клубамі не разглядаюцца.

— Хачу нагадаць, што выпускны вечар — гэта свята развітання са школай, у якой малады чалавек правёў 11 гадоў свайго жыцця, таму яно павінна прайсці менавіта ў сценах навучальнай установы, — падкрэсліла Ірына Каржова.

У 2018/2019 навучальным годзе ў краіне функцыянавала 3035 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (у папярэднім — 3067), а колькасць навучэнцаў упершыню за многія гады перавысіла мільён чалавек. На жаль, працэс аптымізацыі сеткі навучальных устаноў яшчэ не завершаны, таму, хутчэй за ўсё, 1 верасня 2019 года адчыняць свае дзверы не ўсе школы. Вядома, што ў новым навучальным годзе да профільных педагагічных і аграрных класаў дабавяцца яшчэ і профільныя спартыўна-педагагічныя класы.

«У прынцыпе, выступіць з ініцыятывай аб адкрыцці профільных класаў можа любое ведамства, — запэўніла Ірына Каржова. — Напрыклад, неабходнасць адкрыцця спартыўна-педагагічных класаў абгрунтавала Міністэрства спорту і турызму, аграрных — Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. А мы такую форму прафарыентацыйнай работы толькі вітаем. З выпускнікоў педагагічных класаў выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці прыкладна 25 працэнтаў ад агульнай колькасці. І гэта лічба нас цалкам задавальняе. Вельмі добра, калі яшчэ ў школе малады чалавек пераконваецца ў правільнасці свайго прафесійнага выбару. Хачу падкрэсліць, што галоўнае — гэта не адзнакі, а сацыялізацыя выпускніка. Калі на момант заканчэння школы малады чалавек усведамляе свой далейшы жыццёвы шлях, мы лічым гэта самым галоўным дасягненнем».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выведаць галоўнае

АРЫГІНАЛ ЦІ ПАДРОБКА?

Менш за ўсё моладзь настроена пераплачваць за адзенне і абутак

Беларусь, па некаторых ацэнках, уваходзіць у дзясятку краін з найбольш лаяльным стаўленнем насельніцтва да кантрафактнай прадукцыі. Гэты сумны факт пацвярджаюць і вынікі даследавання «Маладзёжны брэнд»: маладыя не бачаць нічога ганебнага ў тым, каб парушыць аўтарскае права іншага, пры гэтым вельмі строга аберагаюць сваё. Яны спакойна ставяцца да таго, што ў цэнтры Мінска можна набыць брэнды-паразіты, і самі іх набываюць. Стаўленне моладзі да кантрафактнай прадукцыі і нелегальнага гандлю аказалася ў цэнтры ўвагі штогадовага сацыялагічнага даследавання «Маладзёжны брэнд», якое праводзіцца Асацыяцыяй абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» сумесна з Маладзёжнай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў БРСМ.

У 2018 годзе ім былі ахоплены больш за 1,2 тысячы беларусаў ва ўзросце ад 18 да 32 гадоў, якія прадстаўляюць асноўныя тэрытарыяльна-эканамічныя зоны Беларусі. Акрамя сталіцы і абласных цэнтраў, у даследаванне трапілі Светлагорск, Хойнікі, Пінск, Кобрын, Бабруйск, Горкі, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Паставы, Наваполацк, Ваўкавыск, Зэльва, Юрцава, Жамчужны, Дрыбін, Лельчыцы, Сеніца, Станькава і Бераставіца.

НЕ ЭКАНОМЯЦЬ НА ГАДЖЭТАХ

— Мы маем на руках багаты аналітычны матэрыял, — падкрэслівае **намеснік старшыні асацыяцыі «БелБрэнд» Валянціна ДЫНІЧ.** — Даследаванне дапамагае нам скласці агульную карціну наконт таго, як змяняюцца пакупніцкія перавагі спажыўцоў з улікам іх узросту, узроўню адукацыі, месца пражывання, палавой прыналежнасці і сямейнага статусу.

Як высветлілася, большасць рэспандэнтаў знаёмыя з тэрмінамі «кантрафакт» і «кантрафактная прадукцыя» (76 %). Толькі кожны чацвёрты канстатаваў, што ён не ведае ці не можа даць дакладнае вызначэнне гэтым паняццям.

— Калі мне кажуць, што моладзь выбірае кантрафакт па прычыне адсутнасці грошай, я з гэтым тлумачэннем не магу пагадзіцца. У выпадках, калі размова ідзе пра іх здароўе і бяспеку, яны аддаюць перавагу арыгіналу, — падкрэслівае Валянціна Дыніч. — **Найбольш крытычна рэспандэнты ставяцца да лекавых сродкаў, харчовых тавараў і біялагічна актыўных дабавак —** практычна ўсе ўдзельнікі апытання выбралі ў гэтых катэгорыях арыгіналы. А самае лаяльнае стаўленне да кантрафакту выказваюць у катэгорыях «адзенне» і «абутак». Варта таксама заўважыць, што ў катэгорыі «аўтамабільныя запчасткі» практычна кожны трэці рэспандэнт аддае перавагу кантрафактнай прадукцыі, аднак уласны аўтамабіль ёсць далёка не ва ўсіх, таму гэта меркаванне не абапіраецца на ўласны вопыт.

Удзельнікі апытання гатовы пераплаціць ад 10 да 20 % ад кошту тавару, калі гэта гарантуе ім арыгінальнасць, у катэгорыях «харчовыя тавары», «лекавыя сродкі» і «біялагічна актыўныя дабаўкі». Таксама большая палова рэспандэнтаў гатовы пераплаціць ад 10 да 20 % за арыгінальнасць камп'ютараў, ноўтбукаў і мабільных тэлефонаў.

«ПРЫМАЛЬНАЯ» ЯКАСЦЬ І НЕВЫСОКІ КОШТ

Калі даследаваліся ўстаноўкі моладзі на набыццё кантрафактнай прадукцыі, 10 % рэспандэнтаў адказалі «буду набываць» і 30 % — «хутчэй, буду набываць». На арыгінальную прадукцыю арыентаваныя 43 % апытаных, каля 17 % удзельнікаў апытання не змаглі сфармуляваць сваю пазіцыю па гэтым пытанні.

Асноўным матывам набыцця кантрафактнай прадукцыі моладзь называе больш нізкую цану ў параўнанні з арыгіналам (96 %). Таксама для значнай часткі рэспандэнтаў (68 %) гэта «прымальны ўзровень якасці ў кантрафактнай прадукцыі». Для кожнага трэцяга рэспандэнта мае значэнне даступнасць набыцця кантрафакту ў іх населеным пункце.

Самым распаўсюджаным матывам адмовы ад набыцця падробак удзельнікі апытання назвалі «нізкую якасць кантрафакту ў параўнанні з арыгінальнай прадукцыяй» (78 %). Таксама на гэту ўстаноўку ўплывае папярэдні негатыўны досвед набыцця кантрафактнай прадукцыі (41 %). Кожны чацвёрты рэспандэнт выбірае арыгінальную прадукцыю, паколькі можа сабе яе фінансава дазволіць (маюцца на ўвазе рэспандэнты, якія свядома адмаўляюцца ад кантрафакту).

Сярод моладзі, якая набывае кантрафактную прадукцыю, большая палова рэспандэнтаў карыстаюцца пры гэтым паслугамі інтэрнэт-магазінаў.

Для прадухілення з'яўлення і распаўсюджвання кантрафактнай прадукцыі 19 % апытаных прапанавалі ўзмацніць кантроль на мяжы (мытні), 16 % — зрабіць больш жорсткім заканадаўства ў адносінах да кантрафакту і 12 % — увесці забарону на яе ўвоз у краіну.

Кожны пяты лічыць, што з кантрафактнай прадукцыяй, якая ўжо трапіла ў Беларусь, нічога не трэба рабіць. Столькі ж лічаць, што яе трэба знішчаць. І каля 9 % удзельнікаў апытання выказалі прапанову адпраўляць кантрафакт назад па месцы яго вытворчасці.

ПА ФІЛЬМЫ І МУЗЫКУ... У ІНТЭРНЭТ

А як моладзь ставіцца да брэндаў-паразітаў? Значная частка рэспандэнтаў канстатавалі, што набывалі падобныя тавары, паколькі пераблыталі іх з арыгіналам (43 %). Кожны трэці ніколі не набываў прадукцыю брэндаў-паразітаў, а кожны пяты — рабіў гэта свядома.

Сярод маладых людзей, якія набывалі калі-небудзь прадукцыю брэндаў-паразітаў, кожны трэці быў задаволены іх якасцю, а не задаволены — кожны пяты. На думку кожнага трэцяга рэспандэнта, імітацыя арыгінальнага брэнда дапушчальная, калі яна не шкодзіць рэпутацыі арыгінальнага брэнда (32 %). Таксама для 30 % маладых людзей імітацыя брэнда дапушчальная ў адносінах да пэўных груп тавараў. Толькі 22 % рэспандэнтаў лічаць, што імітацыя брэнда — гэта падман пакупнікоў, а 15 % лічаць яе цалкам дапушчальнай.

Сёлетні фестываль «Гальшанскі замак» атрымаўся надзвычай цэласным. Дзейства, якое пачалося ў цэнтры горада, паступова перамясцілася да замка, а пасля плаўна, без заўважных перапынкаў, перацякала з адной пляцоўкі на іншую. Праграма ўвесь час была насычанай — можна было і здзіўляцца, і захапляцца, і проста атрымліваць асалоду. Са сцэн не прагучала ніводнага афіцыйнага каментарыя — хоць гаспадары, прадстаўнікі ўлады былі сярод прысутных. І гэта таксама слушна — аддаць увесь святочны час у распараджэнне рэканструктараў, музыкаў і яе вялікасці гісторыі.

Дзесяць гадоў таму «Гальшанскі замак» прыдумалі ў гурце «Стары Ольса» (на дзесяцігоддзе самога гурта) як першы анімацыйны фестываль. З таго часу гэтыя музыкі з'яўляюцца заўсёднікамі фестывалю. Можна было пачуць іх і сёлета (як і не менш каларытны гурт сярэднявечнай музыкі «Літы талер») — і нават дзеля гэтага аднаго можна было спецыяльна завітаць у Гальшаны.

У тым, што фестываль будзе працягвацца, няма ніякіх сумненняў. А нам усім хочацца пажадаць яшчэ больш такіх свят, цёплых, сапраўдных, з прадстаўленнем усяго таго найлепшага, што мы мелі — і не страцілі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Андрэя САЗОНАВА.
Ашмянскі раён.

Шануй сваё!

ВІНТАЖНЫ РОЛС-РОЙС І АРХІТЭКТУРА ЛАНГБАРДА

«Звязда» не так даўно пісала пра брытанскага архітэктара Цзыўая Со, які спраектаваў Беларускую мемарыяльную капліцу ў Лондане, і пра тое, што яна была прызнана адным з найпрыгажэйшых будынкаў Еўропы. А зусім нядаўна стала вядома, што архітэктар узяўся за новы праект, таксама натхнёны нашай краінай. Ён прыдумаў новы павільён для найстарэйшага ў свеце дылера і рэстаўратара вінтажных аўтамабіляў «Ролс-Ройс» і «Бэнтлі». Будынак новага галаўнога офіса кампаніі размесціцца ў Сюрэі (Вялікабрытанія). Збудаванне ўзвядуць у індустрыяльным раёне, які ўзнік у 1920-х гадах. І на тое, які яно будзе мець выгляд, Цзыўая Со натхніла архітэктура Іосіфа Лангбарда 1920-х гадоў, якую ён убачыў (занатаваў, замаляваў) у Мінску.

Фота Сашы БЕЛАВОКАЙ.

— Я быў у добрым сэнсе ўражаны канструктывісцкімі будынкамі, якія бачыў у Беларусі, — расказаў Цзыўай Со нашаму карэспандэнту. — Архітэктуру гэтага стылю (натхнёную супрэматызмам) доўгі час адносілі да спадчыны заходняй мадэрнісцкай школы. Канструктывісцкі і супрэматычны рух разглядалі як найбольш інтэнсіўны і ўплывовы ў архітэктуры XX стагоддзя. Беларусь адыграла важную ролю ў развіцці гэтай ідэі. Віцебск быў эпіцэнтрам, у якім развіваўся авангардызм таго часу, гэты працэс моцна звязаны з такімі гігантамі, як Казімір Малевіч і Эль Лісіцкі.

Новы будынак у Сюрэі спраектаваны такім чынам, каб наведвальнікі маглі бачыць, як рэстаўруюцца вінтажныя аўтамабілі. Госці павільёна будуць перамяшчацца з шоўрума на першым паверсе цераз асобны мост на верхнім паверсе да абліцаваных празрыстым полікарбанатам памяшканняў аўтамайстэрань, дзе змогуць убачыць увесь працэс рэстаўрацыі.

Дызайн аўтамабільнага павільёна з выпуклым закругленым кутом быў натхнёны старым будынкам нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, а таксама старой фабрыкай-кухняй у беларускай сталіцы — дзвюма пабудовамі ў стылі канструктывізму.

І гэта яшчэ не ўсе праекты, звязаныя з Беларуссю, якімі на дадзены момант займаецца брытанскі архітэктар. У каледжы Вулфсан Кембрыджскага ўніверсітэта 2 ліпеня адкрываецца яго персанальная выстаўка (будзе працаваць да 22 верасня). На ёй будуць прадэманстраваны многія малюнкі архітэктара, якія ён зрабіў, калі быў у Беларусі, а таксама яго праекты, якія ўжо атрымалі шматлікія ўзнагароды. Арыгінал малюнка вялікага памеру «Слонім, 1941», натхнёны візітамі гэтага творцы ў Беларусь і асабістымі ўспамінамі сям'і Каплінскіх, будзе прадстаўлены публіцы ўпершыню. Матэрыялы і тэмы, звязаныя з Беларуссю, складуць значную частку гэтай важнай экспазіцыі ў прэстыжным каледжы і сусветна вядомым універсітэце. Некаторыя працы пасля завяршэння выстаўкі будуць перададзеныя ў пастаянную калекцыю музея Вікторыі і Альберта.

— Выстаўка прадставіць абраныя малюнкі і чарцяжы, зробленыя мной ад больш ранніх часоў да сённяшняга дня, — расказвае архітэктар. — Праз гэтыя працы можна прасачыць вытокі маіх ідэй — ад самых першых да больш позніх. Я прэзентую і свае больш вядомыя праекты, такія як Беларуская мемарыяльная капліца ў Лондане, а таксама пан-Еўрапейскі мемарыял ахвярам таталітарызму XX стагоддзя ў Бруселі, яшчэ праект вінтажнай аўтамабільнай галерэі і працу для Fank Dale & stepsons і іншыя праекты. Каля 40 працэнтаў прац на выстаўцы маюць адносіны да Беларусі, таксама я ўпершыню пакажу публіцы мае малюнкі, натхнёныя візітамі ў Слонім і асабістымі ўспамінамі пра сям'ю Каплінскіх. Маё сяброўства з імі пачалося з таго, што Сямён Каплінскі (дзядзька Наташы Каплінскай) аднойчы наведаў Беларускую царкву ў Лондане і вельмі ўпадабаў яе — з гэтага пачалося добрае сяброўства.

Цзыўай Со таксама працуе над праектам рэстаўрацыі сінагогі ў Слоніме. Ён заклікае беларускіх архітэктараў далучацца да працы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Праект павільёна для вінтажных аўтамабіляў натхнёны беларускай архітэктурай Іосіфа Лангбарда.

ПАНТЭОН ДЗЯЎЧЫНЫ

Язэп Руцкі

(1574—1637)

З поўным правам Язэпа Руцкага лічаць стваральнікам уніяцкай царквы. Ён працягваў справу першых уніяцкіх мітрапалітаў Рагозы і Пацея, умацаваў яе, пашырыў і зрабіў сапраўднай царквой. Унія цэркваў была спробай кампраміснага вырашэння праблемы падзелу хрысціянства ў Рэчы Паспалітай на дзве канфесіі — каталіцтва і праваслаўе.

«Літвінская нацыя» (як называў Руцкі беларусаў) была раз'яднаная рэлігіяй. Каб пазбегнуць гэтага падзелу, праваслаўныя епіскапы і прадстаўнікі Папы Рымскага ў 1596 годзе заключылі ў Бярэсці царкоўную унію. Праваслаўная царква Рэчы Паспалітай падначальвалася Папу Рымскаму, але захоўвала ўсе свае ранейшыя прэрагатывы і адметнае богаслужэнне.

Па-хрысціянску набожны і па-свецку дзейсны тэолаг, мысляр, палітык і асветнік, маючы за спінай выдатную адукацыю ў Карлавым універсітэце ў Празе і Грэчаскім калегіуме ў Рыме, гэты юнак з маёнтка Рута каля Навагрудка прагнуў прымянення сваім талентам і сілам, што і прадвызначыла рэфармацкі і стваральны характар яго дзейнасці. Ён уяўляецца чалавекам будучыні (той будучыні, калі хрысціянства ўсвядоміць неабходнасць збліжэння хрысціянскіх канфесій), які трапіў у час, калі грамадства проста не выспела для ўспрымання яго ідэй і мэт, яго апантанай дзейнасці, — яно было варожым, ваяўнічым да таго, хто наважваўся перайначваць стары лад жыцця. І ў якіх бы неспрыяльных умовах ні давялося рабіць Руцкаму «сваю царкву», але ягоная энергія, унутраная моц і перакананне аб'ядноўвалі вакол яго аднадумцаў, а яны былі той творчай сілай, якая будавала духоўнае жыццё Беларусі.

Ва ўніяцкай дзейнасці Руцкі змог праявіць сябе як наватар і стваральнік. Менавіта гэтыя якасці разглядзеў у ім Папа Рымскі Клімент VIII падчас вучобы Язэпа ў Грэчаскім калегіуме і настаяў, каб ён паслужыў уніяцкай царкве. Пасля вяртання з Рыма ў 1601 годзе Руцкі ўзначаліў Віленскую ўніяцкую семінарыю. Тады ж ён задумаўся, як умацаваць новую царкву. «Сапраўдная святасць мае сваё гняздо ў Духу. Да яе вядзе манаскі вобраз жыцця, які не толькі ў адмаўленні ад грамадства свецкіх людзей, але і ў выкананні трох абетаў — жабрацтва, цнатлівасці і паслушэнства». Абноўленае манаства і павінна было, па задуме Руцкага, здзейсніць рэформу ўніяцтва.

Новы этап у жыцці Руцкага пачаўся пасля прыняцця манаства ў Віленскім Свята-Троіцкім манастыры. Вакол Руцкага аб'ядналася кола маладых манахаў знатнага паходжання. Ён шчодра дзяліўся з імі сваімі багатымі ведамі, вёў іх дарогамі святасці і набожнасці. Дзякуючы руплівасці Руцкага манастыр стаў узорам манаскага жыцця і цэнтрам паломніцтва. У 1608 годзе ўніяцкі мітрапаліт Іпацій Пацей прызначыў Руцкага «головным намесником митрополии» і аддаў пад яго «зупольную моць» чорнае і белае святарства. Супраць гэтага прызначэння былі пратэсты і нават судовыя разборкі. Сам гаспадар Жыгімонт Ваза вымушаны заступіцца за Руцкага, пацвердзіць яго прызначэнне і выдаць яму прывілей на ігуменства ў Свята-Троіцкім манастыры.

Перад Руцкім раскрыліся шырокія перспектывы для дзейнасці. Былыя вучні сталі яго паплечнікамі. Руцкі накіраваў іх у Менск і Навагрудак для заснавання там уніяцкіх манастыроў. Пад уплывам Руцкага смаленскі кашталян Іван Мялешка прыняў уніяцтва і ў сваёй вёсцы Жыровічы заснаваў уніяцкі манастыр, які ў будучыні стане адной са святыняў Беларусі.

Стаўшы ў 1613 годзе ўніяцкім мітрапалітам, Руцкі разгарнуў актыўную дзейнасць ужо са значным размахам і распрацаваў праграму развіцця ўніяцкай царквы. У 1617 годзе на з'ездзе прадстаўнікоў быценскага, віленскага, жыровіцкага, менскага і навагрудскага манастыроў у Навагрудку Руцкі выклаў свой погляд на «новую схему царкоўных адносін» і прадставіў напісаны ім статут уніяцкага ордэна. Пасля дзесяці пасяджэнняў статут нарэшце быў прыняты. Патронам ордэна выбралі св. Базыля (Васіля Вялікага), таму і ордэн назвалі базыльянскім. Руцкі перадаў ордэну ўніяцкую асвету «для увиченя людей молодых». Неўзабаве па ўзроўні адукацыі ўніяцкія школы зраўняліся з лепшымі на той час езуіцкімі школамі. Для выкладання Руцкі запрашаў прафесараў з іншых навучальных устаноў, сам складаў навучальныя праграмы. Не толькі навукам хацеў навучаць моладзь Руцкі, але і святасці. «Патрэбныя настаўнікі не толькі ў навуцы, але ў дабрачэснасці і дабрадзейнасці».

Поспехі уніі трывожылі як каталікоў, так і праваслаўных. Так што будаваць уніяцкую царкву Руцкаму даводзілася ў неспрыяльных умовах. Праваслаўныя фанатыкі забілі ўніяцкага полацкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча і ігумена кіеўскага Выдубіцкага манастыра Антона Граковіча. І на самога Руцкага быў замах. На соймах праваслаўная шляхта патрабавала скасавання уніі. Мітрапаліт нават грудзьмі стаў на шляху віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла, які намерыўся па соймавай пастанове адабраць ва ўніятаў Свята-Троіцкі манастыр. «Мы хутчэй дазволім забіць сябе, чым дапусцім схізматыкаў валодаць святымі месцамі».

Бараніў Руцкі унію і словам. У сваіх кнігах ён палемізаваў з апалагетам праваслаўя, полацкім епіскапам Мялеціем Сматрыцкім. Неаднойчы ён звяртаўся да Сматрыцкага, жадаючы зрабіць яго сваім паплечнікам. Аднак толькі пасля паездкі ў Канстанцінопаль (Стамбул), калі ўвачавідкі ўбачыў занядбаны стан і нікчэмнасць канстанцінопальскага патрыярха, Сматрыцкі пераканаўся ў слушнасці меркаванняў дзеячаў уніяцтва, якія бачылі выратаванне праваслаўя ў саюзе з апостальскім пасадам. Прыняўшы ўнію, Сматрыцкі стаў паплечнікам Руцкага, дапамагаў яму ў стварэнні патрыярхата ў саюзе з праваслаўнымі. Але праваслаўныя ерархі ў 1629 годзе не прыехалі на ўстаноўчы з'езд у Львоў, і гэты намер так і не здзейсніўся.

Не ўсё задуманае ажыццявіў Язэп Руцкі, але і зробленае ім стала трывалым падмуркам, на якім больш за два стагоддзі стаяла ўніяцкая царква, якая была «народнай царквой» большасці беларусаў і дазволіла ім захаваць сваю беларускасць — нацыянальную адметнасць. Незадоўга да смерці, у 1637 годзе, Руцкі ў лісце да Папы Рымскага Урбана VII падвёў вынікі сваёй дзейнасці: «Амаль трыццаць гарадоў прынялі унію: Вільня, Навагрудак, Луцк, Уладзімір і іншыя. У нас ужо да дваццаці манастыроў і больш, якія займаюць нашы манахі-базыльяне (на той час ужо было 36 базыльянскіх манастыроў. — **Аўт.**). Гэтыя манахі трымаюць школы для выхавання юнакоў, і з Віленскай нашай школы або семінарыі пачалі выходзіць багасловы, дасведчаныя ў грэчаскай і лацінскай мовах, чаго пры нашых бацьках на Русі не бывала». Заснаваны Руцкім Ордэн базыльянаў адыграў адметную ролю ў духоўным жыцці Беларусі, яе культуры, мастацтве, дойлідстве. І цяпер беларускія гарады ўпрыгожваюць былыя ўніяцкія храмы (самы вядомы з якіх — перабудаваны ўніятамі славуты Сафійскі сабор у Полацку). Унія — унікальная гістарычная з'ява, значная падзея ў нашай гісторыі. Калі зразумець гэта, дык і постаць Язэпа Руцкага набывае манументальную веліч. Хоць Папа Рымскі і называў Язэпа Руцкага «атлантам уніі» і «слупом царквы», сам ён сціпла лічыў сабе «вікарыем яго ў гэтым царстве».

Вітаўт ЧАРОПКА.

Сваімі словамі

ВЕЛІКОДНЫЯ ПАДАРУНКІ

Перад Вялікаднем бабуля падарыла мне свой гадзіннік. Дакладней, спачатку папрасіла занесці яго ў майстэрню, наладзіць. А пасля таго, як ён запрацуе, прапанавала забраць сабе. Я напачатку вагалася, ці патрэбна мне старая рэч? Але пасля палюбіла падарунак усёй душой.

«Вельмі добры ў вас гадзіннічак», — сказала майстрыха ў рамонтнай крамцы з прыязнай усмешкай, — было зразумела, што рэч ёй насамрэч падабаецца. Яна зірнула, колькі часу, пераставіла стрэлкі, накруціла механізм — і, вуаля, усё запрацавала. Высветлілася, што паломкі не было — проста спыніўся выдатна наладжаны механізм. «Можа быць, ён пазалочаны», — дадала жанчына за шклом. Праўда, пробу адшукаць нам так і не ўдалося. Канчатковую выснову можа зрабіць толькі ювелір.

Бабуля набыла сабе прыгожы «пазлачаны» гадзіннік шмат гадоў таму. Берагла, захоўвала ў спецыяльным футлярчыку. Думала, будзе насіць пры асаблівых нагодах. Колькі іх было за няпростае жыццё? Мяркую, яна змагла б пералічыць іх па пальцах рук. Складаны быў лёс: увесь час праца — на сябе і на калгас, — а адпачываць проста было не прынята. Хіба што да замужжа вяскоўцы хадзілі на вячоркі. А пасля ўсё — «хамут на шыю адзела» — час ад часу менавіта такі выраз ужывае бабуля.

Кожны дзень я атрымліваю асалоду, калі накручваю яго. Ад усведамлення, што гадзіннічак якасны, што падораны менавіта мне, і ад спадзявання, што прапрацуе яшчэ вельмі доўга. А сваімі простымі рухамі я быццам сілкую яго нябачнай энергіяй, ажыўляю на цэлы новы дзень. То чаму б крыху не парадавацца з гэтай нагоды?

Майму стрыечнаму брату Сяргею бабуля падарыла... баян «Эцюд». Таксама стары, савецкі, крыху запылены. Папярэдне клапатліва прасушыла яго на сонцы. Баян насамрэч належаў маёй маме, але яна справу музіцыравання ніколі не любіла (таму ўласных дзяцей у музычныя школы не аддавала). А вось стрыечны брат мае абсалютны музычны слых — ён і ў дзяцінстве свабодна мог і на гітары любую мелодыю падабраць, і клас баяна ў гімназіі-каледжы скончыў. Ужо шмат гадоў не трымаўшы ў руках гэты музычны інструмент, ён літаральна хвілінку пасядзеў, дакранаючыся да клавішаў, нібы зноў знаёмячыся і кажучы ім «прывітанне», а пасля свабодна і лёгка зайграў мелодыю!

Сяргей кажа, што «Эцюды» рабілі надзвычай якаснымі. А яшчэ — што цяпер баяны зноў уваходзяць у моду, апераджаюць гітару, якая ёсць у многіх. Яны лічацца ўжо чымсьці амаль экзатычным, а таму моцна прываблівающь увагу ў кампаніі. З'явіся з такім на сяброўскай бяседзе — адразу зробішся папулярным.

Добра прыгадваецца кульмінацыя гэтага падарункавага Вялікадня. Што ж уручылі самой бабулі?

Гаспадарка Ніны КАРПУК — гэта куры, пеўнік і кот.

Гадзіннік сапраўды прыгожы і сёння, ззяе і пераліваецца. Дзівосным чынам ён гарманіруе з іншымі маімі ўпрыгожваннямі. І цяпер ужо не такая істотная яго каштоўнасць. Я адчуваю, што гэта падарунак, зроблены з любоўю. Рэч, купленая калісьці як вельмі жаданая. Бабуля даставала яго, каб паглядзець, ці ў парадку, каб палюбавацца. Верыцца, што часы змяніліся. І адчуваю на сабе нябачнае пасланне-абавязак: знаходзіць час на асаблівыя дні і вечары, быць шчаслівай у кожным моманце, не дазволіць руціне заглынуць яскравасць адчуванняў і ўзнёслыя перажыванні — здаецца, пакуль атрымліваецца. А цяпер яшчэ і гадзіннік дапамагае.

У яе вачах заблішчэлі слёзы, яна выглядала такой шчасліва-ўзрушанай у той момант, калі ў сені ўвайшоў апошні ўнук і, акрамя жоўтых кветак і пакунка цукерак, уручыў, а дакладней, паставіў на падлогу, скрынку з... трыма жывымі курачкамі! Думаю, не трэба больш падрабязна апісваць эмоцыі прысутных, у тым ліку маленькіх праўнукаў. Такое вось папаўненне гаспадаркі!

Думаю, што ўсе пералічаныя падарункі па праве можна назваць кранальнымі, арыгінальнымі, важнымі. І прыгадваюцца словы: «Ніводзін падарунак не можа быць настолькі маленькім, каб яго не падарыць, калі ён упакаваны ў любоў і клопат».

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Логойский сельский исполнительный комитет проводит 25 июня 2019 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.	Задаток (рублей)
1	д. Гаище, ул. Полевая, 12, 623284601301000124	0,1300	газо-, водоснабжение	10 000.00	1898,46 + реклама	1000.00
2	д. Замосточье, ул. Центральная, 25А 623284602301000029	0,1428	электроснабжение	3 500,00	1609,63 + реклама	350,00
3	аг. Косино, ул. Ф. Г. Крылова, 1А, 623284603201000353	0,1041	газо-, водо- и электроснабжение	6 000.00	1894,71 + реклама	600.00
4	д. Свидно, ул. Центральная, 26, 623284605201000114	0,1495	электроснабжение	4 000,00	1696,68 + реклама	400,00

Земельный участок в аг. Косино, ул. Ф. Г. Крылова, 1А имеет ограничения в использовании площадью 0,1041 га в связи с расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора). Земельный участок в д. Свидно, ул. Центральная, 26 имеет ограничения в использовании площадью 0,1495 га в связи с расположением в водоохранных зонах рек и водоемов.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000 БИК AKBB BY 2X г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Аукцион состоится 25 июня 2019 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений — 19 июня 2019 года до 17.00**. Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11

ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1	**Раздел и установление порядка пользования земельным участком** **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения** **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ» 8 (0232) 29 51 12

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– Капитальное строение (магазин № 9) с инв. № 350/С-85625, площадью 326,3 кв. м (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное основное строение, одноэтажная блочная пристройка, навес с эстакадой, навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275; – охранно-пожарная сигнализация (инв. № 22358); – капитальное строение (сарай металлический магазина № 9) с инв. № 350/С-202808, площадью 72,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275/1. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006135 площадью 0,1031 га. Цель использования – розничная торговля продовольственными товарами	**720 000,00**	**72 000,00**
2	– Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-340442, площадью 50,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 301-4. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007005030 площадью 0,2934 га. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами	**105 000,00**	**10 500,00**

Срок подачи заявления	**По 4 июня 2019 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**6 июня 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 21.05.2019 г.*
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. **Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа: по Лоту № 1 — на 3 (три) месяца, по Лоту № 2 — на 2 (два) месяца**. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

Предмет аукциона и его местонахождение	**Лот № 3 –** здание бывшей пожарной части в Волковысском районе, аг. Подороск, ул. Брестская, 21
Начальная цена предмета аукциона	21 123 руб.; размер задатка – 2 200 руб. (Покупателю имущества в установленном порядке может быть предоставлена рассрочка оплаты приобретенного имущества)
Продавец недвижимого имущества	Отдел культуры Волковысского райисполкома. Тел.: 8 (01512) 4 51 74, 4 50 25
Характеристика объектов	**Капитальное строение с инв. № 410/С-15646 (здание пожарной части с двумя пристройками, навесом** (инв. № 01000120) – 1996 г. п., 1 этаж, S общ. – 245,2 кв. м, кирпичное, полы – плиточные, плита ДСП, керамическая плитка, крыша – волнистый шифер, окна – дерево, ПВХ, навес – 10 кв. м, на металл. столбах, стены решетчатые из кирпича, высота 1,0 м, полы – плитка тротуарная, кровля – шифер волнистый; **мощение с бордюром** (инв. № 01100217) – плитка цементно-песчаная, 134,0 кв. м, бордюр бетонный 22,10 м). **Воздушная линия электропередачи** (инв. № 01200071) – 20,0 кв. м, кабель марки АВВГ 4*10
Информация о земельном участке	Срок аренды земельного участка площадью 0,1171 га (под застройкой) по 1 апреля 2069 г.
Условия продажи недвижимого имущества*	Использование приобретенного объекта под цели, не противоречащие законодательству Республики Беларусь, начало использования – не позднее 3 лет с даты заключения договора купли-продажи
Условия использования земельного участка	В установленном порядке использовать земельный участок для размещения туристических объектов с условием сохранения историко-культурной ценности, обеспечения охраны и реставрации значимых в историко-культурном отношении зданий и сооружений; получение архитектурно-планировочного задания и технических условий для инженерно-технического обеспечения объектов строительства, разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и строительство или получение решения Волковысского РИК об изменении назначения недвижимого имущества без проведения строительно-монтажных работ (в случае изменения назначения недвижимого имущества, реализуемого на аукционе); осуществление строительства, реконструкции объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией
Ограничения по использованию земельного участка	Водоохранные зоны рек и водоемов на площади 0,1171 га

1. Аукцион состоится **6 июня 2019 года в 12.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **31 мая 2019 года до 17.00**.

2. **Организатор аукциона** – комитет государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета (комитет «Гроднооблимущество»), г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) тел.: (8-0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02, сайты: http://www.region.grodno.by, http://www.gki.gov.by.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в государственной собственности, без продажи права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания отчуждаемого имущества, утвержденным постановлением СМ РБ от 26.03.2008 № 462, Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением СМ РБ от 12.07.2013 г. № 609.

4. Аукцион является открытым, его участниками могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные юридические лица, иные иностранные организации, иностранные индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства.

К участнику, выигравшему торги, но отказавшемуся или уклонившемуся от подписания протокола и (или) договора купли-продажи недвижимого имущества и (или) договора аренды земельного участка, и (или) возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, а также к участникам, отказавшимся объявить свою цену за предмет аукциона в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего аукцион признан нерезультативным, к претенденту на покупку в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи недвижимого имущества и (или) договора аренды земельного участка будут применены штрафные санкции, предусмотренные законодательством.

5. **К заявлению прилагаются следующие документы:**

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет организатора аукциона № BY75AKBB36425010002834000000, код AKBBBY21400 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549;

для юридических лиц Республики Беларусь – копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;

для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации;

для иностранных юридических лиц, иных иностранных организаций – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально;

для иностранных индивидуальных предпринимателей – легализованная в установленном порядке копия документа, подтверждающего статус, с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иной иностранной организации, иностранного физического лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном порядке, с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально.

Консолидированный участник к заявлению на участие в аукционе прилагает следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями (с нотариальным удостоверением) и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

6. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

7. **В течение 10 рабочих дней** после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

8. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) действий, предусмотренных **в пункте 7**, и представления копий платежных документов, **но не позднее двух рабочих дней**, с продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка и осуществляется их государственная регистрация в установленном порядке

Извещение о проведении 21 июня 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Местонахождение	Начальная цена с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Изолированное помещение общей площадью 109,2 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 350/D-11766 (назначение: административно-торговое помещение); система видеонаблюдения с инв. № 6443; система охранной сигнализации с инв. № 9153	г. Гомель, ул. Советская, 119	165 082,38	16 500,00

Продавец имущества: ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 21 июня 2019 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.05.2019 по 19.06.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»)

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ на право заключения договора аренды земельного участка

Наименование объекта	**Лот № 1**
Целевое назначение	установка остановочного пункта со встроенным киоском
Местонахождение объекта	г. Малорита, ул. Советская
Продавец объекта	Малоритский районный исполнительный комитет
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет
Начальная цена продажи, руб.	54,49 (пятьдесят четыре рубля 49 копеек)
Сумма задатка, руб.	5,45 (пять рублей 45 копеек)
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), кадастровый номер	0,0025 га; кадастровый номер 125250100001000844 решение Малоритского районного исполнительного комитета от 08.04.2019 № 426
Ограничения в использовании земельного участка	- охранная зона канализационных коллекторов самотечной канализации на площади 0,0025 га
Вещное право, срок аренды земельного участка	Аренда, срок – 10 лет
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб.	*295,92*
Условия продажи	1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся: 1.1. внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); 1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в том числе на формирование земельного участка, государственной регистрации создания этого земельного участка. 2. В двухмесячный срок с даты проведения аукциона осуществить государственную регистрацию возникновения права на земельный участок и ограничений в использовании земельного участка в Малоритском бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», г. Малорита, ул. Ленина, 9. 3. В установленном законодательством порядке разработать техническую документацию (проектно-сметную) на строительство объекта. 4. После получения разрешения на строительство объекта снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства придомовой территории. 5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее срока установленного законодательством

Аукцион состоится **27 июня 2019 года в 11.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.

Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 30 80, 2 30 17, 2 21 07, 2 30 01.

Для участия в аукционе представляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом;

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с № в Малоритский районный бюджет, на расчетный счет BY85AKBB36002230002410000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка AKBBBY2X, УНП 200676206, главное управление Министерства финансов РБ по Брестской области, код платежа 04002;

- граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков;

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

Заявления об участии в аукционе принимаются по 21 июня 2019 года (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 82, землеустроительная служба Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням

На ўласныя вочы

НУДНА БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ

Гэтую і многія іншыя цытаты з савецкага фільма «Вяселле ў Малінаўцы» падчас паездкі ў госці да жоўта-блакітнай сястры мы згадвалі пастаянна. Бо душа то разгортвалася, то зноў згортвалася. Пасля пяцігадовага перапынку мы вырашылі наведаць сваю малую гістарычную радзіму — вёску Харобічы на Чарнігаўшчыне. З-за вядомых палітычных падзей яна даўно за межамі дзяржавы, грамадзянамі якой мы з'яўляемся. Так здарылася з многімі людзьмі таго пакалення, на вачах якога разваліўся магутны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Межы, пазначаныя на карце, даволі працяглы час не адпавядалі межам рэальным. У першай палове 90-х толькі дзве будкі пазначалі пераезд з Беларусі ва Украіну. Прасёлкавая дарога была даступная для суседзяў, братоў, пляменнікаў, швагераў і дзевераў, якія здаўна перамяшаліся і перамяшчаліся ў той зоне, якая сёння завецца прымежнай. Звычка вольна пераадольваць адлегласць у 80 кіламетраў напрамкі заставалася ў нас доўга. Пакуль пяць гадоў таму канчаткова не скасавалі магчымасць праезду праз так званыя спрошчаныя пункты пропуску. Цяпер ім можна карыстацца толькі пешшу і толькі жыхарам суседніх вёсак.

Усе гэтыя пяць гадоў матуля горка плакала аб забытых магілах сваякоў, на якія немагчыма трапіць за адзін светлавы дзень. І вось нарэшце мы вырашыліся. Напярэдадні Радаўніцы на машыне выехалі раніцай з Гомеля. Па дарозе некалькі разоў бадзёра абганялі магутную сельгастэхніку, якая ў Добрушскім раёне рухалася працаваць у поле.

Хвілін 15 праводзім на беларускім памежным пераходзе Весялоўка і прыкладна 45 — на украінскім — у Сянькоўцы. Гэта якраз там, дзе знакаміты манумент «Тры сястры». Большая частка часу — чаканне пры адсутнасці чаргі. Беларусы запускаюць кожную з машын, што пад'язджае, украінцы накопліваюць па пяць. Не шукаем логікі. Ветлівыя пагранічнікі на беларускім баку і ў кантрасце — напружаныя ўкраінскія. На звычайнае прывітанне рэагуюць так, быццам ты папытаў у іх ваенную тайну. Вялікія плакаты нагадваюць, што сала, як і іншыя прадукты харчу, цяпер катэгарычна забаронена перамяшчаць з краіны ў краіну. Пры выездзе на тэрыторыю Украіны пытаем у пагранічніка, што закрывае за намі шлагбаум:

— Па якой дарозе лепш дабірацца да вёскі Харобічы: праз Гарадню ці праз Саланоўку?

— Ні па якой! — упэўнена адказвае хлопец, і тут нарэшце мы бачым шчырую ўсмешку.

У тым, што вайсковец мае рацыю, пераконваемся адразу ж. Таму выбіраем паміж дрэнным і зусім дрэнным. Едзем праз найбліжэйшы райцэнтр Гарадню. Ад Сянькоўкі да яе — 30 кіламетраў. Яшчэ 18 — да нашых Харобічаў. У дарозе настальгічна ўспамінаем, як было некалі зручна ездзіць напрамкі. Праўда, мая апошняя паездка на зямлю продкаў пяць гадоў таму па кароткай дарозе не абышлася без прыгод. Два разы машыну выцягвалі з брудных ямін, і ўвогуле 20 кіламетраў па ўкраінскай зямлі я тады ехала даўжэй, чым 60 па беларускай. Калі вярнулася, была гатовая цалаваць родны асфальт.

Таму сёлетні маршрут у 135 кіламетраў (у адзін бок) праз міжнародны пункт пропуску мы палічылі аптымальным. Аднак і цяпер, інакш шляхам, давялося спазнаць цікавосткі ўкраінскіх прасёлкавых, быццам некалі асфальтаваных, дарог. Ехалі на першай-другой перадачы. Здзіўляліся, калі два дзясяткі метраў атрымлівалася праехаць на трэцяй.

Дом і двор, якія зараслі дзікім вінаградам.

Часам здавалася, што пракладваем дарогу ў джунглях — так усё навокал зарасло. Радаваліся, калі бачылі, што палі, пяць гадоў таму заросшыя хмызняком, сёлета дзе-нідзе былі апрацаваныя. Удалечыні ўбачылі адзінокага сейбіта, які з вялікай ёмістасці кідаў у вільготную зямлю зерне. Адразу ж прыйшла на памяць выява са знакамітага савецкага чырвонца 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Калі ўязджалі ў саму вёску, дзе матуля правяла сваё дзяцінства, яе эмоцыі пачалі зашкальваць.

— А тут недзе быў дом дзядзькі Антона! А тут — цёткі Марусі! Ой, нічога ж не пазнаць цяпер...

Між тым вялізная жылая ўкраінская вёска Харобічы сёння больш нагадвае чарнобыльскую зону адсялення. Некалі, у 90-я гады, давялося паездзіць у забруджаныя радыяцыяй раёны. Таму дакладна памятаю і тыя абваленыя дамы, і тыя абрынутыя коміны, і тыя пустыя вачніцы акон... Эфект дэжавю дагнаў.

Дарэчы, закінуты дом маёй бабулі цалкам зарос дзікім вінаградам і праз яго мы прадзіраліся да ганка. Горкае відовішча, і многа слёз. Падлогу, зробленую з шырачэзных ліпавых дошак, якую я некалі ў дзяцінстве мыла пад кіраўніцтвам бабулі, нехта часткова выпілаваў. Грубку, на якой заўсёды ляжала прыгожая саматканая посцілка, разабралі на цагліны. Ад печкі, з якой бабуля даставала духмяную «пячэню», мала што засталося. Усё металічнае, у тым ліку накрыўку на склеп, знялі і вынеслі — на металалом. Люстэрка на адным цвіку — быццам погляд у іншы свет. Свет без святла.

У такім жа жудасным выглядзе ўсе дамы былых суседзяў. Самі яны даўно на тых жа вясковых могілках, што і мая бабуля. Дарэчы, мы ўзялі ўсе неабходныя інструменты і рыхтаваліся да складанай работы па навядзенні парадку. Шчыра здзівіліся, што якраз там было ўсё прыбрана. Вялікія дрэвы нядаўна пасеклі і царкву пафарбавалі ў блакітны колер. Зараснікаў не было, і праходы паміж пахаваннямі паўсюдна расчышчаны.

Потым, калі з братам дафарбоўвалі агароджу, падышла суседка Валя. Адна з нямногіх, хто і цяпер жыве на нашай доўгай вуліцы пад назвай Серадоўка. Яна выгадавала пяцярых дзяцей, аднаго пахавала. Муж адышоў у лепшы свет некалькі гадоў таму. Мы цёпла па-праваслаўнаму павіталіся «Хрыстос Уваскрос», і яна сказала, што па меры сіл даглядала за магілай маёй бабулі ўвесь той час, што мы не прыязджалі. А потым дадала, што спяшаецца на спеўкі — рыхтавацца да канцэрта ў гонар Дня Перамогі. Мы вельмі здзівіліся:

Дом, дзе мы некалі жылі.

— У вас жа адмянілі гэта свята?

— Можа, у каго і адмянілі, а ў нашым сельсавеце яно заўсёды было і будзе, — упэўнена і з гонарам адказала суседка Валя.

Перш чым развітацца, жанчына расказала, што нашчадкі адных знаёмых цяпер працуюць «на клубніцы» ў Польшчы, другіх — мыюць посуд у Германіі, іншых — прыбіраюць у Чэхіі... Яе дзеткі абзавяліся сваімі сем'ямі тут, у вёсках побач, і працуюць на сябе. Маюць жывёлу, трактарок і старанна апрацоўваюць зямлю.

— Цяжка гарбацяцца, — шкадуе Валя сыноў і дачку, — але затое ніхто не галодны.

На зваротнай дарозе спыніліся каля брацкай магілы і помніка ўсім вясковым жыхарам, якія з вайны не вярнуліся. На ім ёсць і імя майго дзеда Якава Талочкі, што прапаў без вестак восенню 1943 года. Адзначылі, што мемарыяльнае месца ў дагледжаным стане. У цэнтры вёскі, між тым, распачата будаўніцтва. Пра гэта сведчыць шыльда на драўляным паркане: «Амбулаторыя агульнай практыкі». Яе, калі верыць надрукаванаму, павінны здаць ужо да канца года. Калі ёсць каго лячыць у вёсцы, можа, населены пункт не асуджаны вымерці?

Разглядалі жоўта-блакітныя агароджы, якія паўсюдна значна збляклі апошнім часам. Здаецца, асвяжаць фарбу на іх ніхто не збіраецца. На тых дамах, якія выглядаюць заможнымі па ўкраінскіх мерках, галоўны знешні атрыбут — спадарожнікавая талерка. З разнастайнай інфармаванасцю, значыць, усё ў іх добра.

У вясковай краме здалося, што жыццё спынілася недзе ў сярэдзіне 70-х. Менавіта тады я хадзіла сюды летам па боханы духмянага белага хлеба. Народ звычайна збіраўся загадзя. Усе імкнуліся першымі купіць цёплыя белыя «цагліны». Так адбывалася і зараз: некалькі жанчын чакалі машыну з хлебам на крэслах каля акна. Калі мы ўвайшлі, яны сталі ўглядацца ў твары з пытаннем: «Чые будзеце?». Радасна ўспаміналі сваякоў па вясковых мянушках і дакладалі, хто памёр, а хто ад'ехаў на заробкі.

Дарэчы, здалося, што асартымент у краме практычна не змяніўся. Побач на паліцах знаходзіліся танныя адэкалоны і цукеркі, фарба і гарэлка, гумавыя боты і каўбасы... Між тым абслужылі нас без праблем па банкаўскай картцы, што было нечакана і прыемна. Мясцовы жыхар на вялікім падпітку марна паспрабаваў памяняць недзе набыты беларускі рубель на грыўні.

Пры выездзе з вёскі раптам заўважылі, што ўздоўж асноўнай дарогі, за загушчанай лесапаласой, пракладзена альтэрнатыўная. Яна грунтавая, але добра накатаная. Тут мы змаглі нават хуткасці дадаць. Так што ў Сянькоўку прыбылі, яшчэ не ўключыўшы фары.

Праўда, наперадзе нас чакала доўгая дарога дадому. Не так проста было развітацца з Украінай. Амаль пяць гадзін у чарзе мы разглядалі абноўлены манумент «Тры сястры», да якога, здавалася, — рукой падаць. У кавярні з нязмененай за апошнія пяць гадоў назвай «Тры сястры» і ўсімі трыма (!) дзяржаўнымі сцягамі на шыльдзе бясконца пілі каву. За суседнім столікам пагранічнік вельмі старанна і доўга перажоўваў ежу... Канчаткова сцямнела, калі трапілі на ўкраінскі дагляд, дзе па рэчах жвава паскакаў невялічкі тэр'ерчык. Ён не знайшоў нічога забароненага, і мы нарэшце перасяклі мяжу.

Дзесяць хвілін на беларускай Весялоўцы — тут усіх інтэлігентна абнюхаў прыгожы, шакаладнага колеру лабрадор — і апоўначы Гомель радасна вітаў нас запаленымі ліхтарамі. Нягледзячы на стомленасць, прыліў пяшчоты да Беларусі быў вельмі шчыры. Праўда, калі засынала, усё бачыла ўкраінскую няроўную дарогу, якая бясконца скакала перад вачыма.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Членскі білет дапамог аднавіць імя абаронцы

Як мы ўжо пісалі, у сярэдзіне сакавіка на месцы былых баёў каля вёскі Гаі Магілёўскага раёна, дзе ў ліпені 41-га трымаў абарону батальён міліцыі пад камандаваннем капітана Уладзімірава, вяліся пошукавыя работы. У іх прымалі ўдзел супрацоўнікі і курсанты Магілёўскага інстытута МУС, для якіх справа гонару аднавіць гераічнае мінулае сваіх калег. На сённяшні дзень вядомы толькі каля чатырох дзясяткаў імёнаў з некалькіх сотняў міліцыянераў, якія стрымлівалі ворага на подступах да Магілёва. У апошні дзень пошукавых работ разам з чалавечымі астанкамі былі знойдзены не характэрныя для салдат часоў Вялікай Айчыннай вайны фрагменты адзення і зброі — высокія боты, наган, пер'евая ручка з запасным пер'ем і дакументы. Спадзяванні на тое, што нешта атрымаецца прачытаць на паперы, якая 78 гадоў ляжала ў зямлі, былі вельмі сціплымі. Аднак эксперты-крыміналісты ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці зрабілі неверагоднае. Спрасаваныя паміж сабой фрагменты паперы, тканіны і палімернага матэрыялу аказаліся членскімі білетамі Асаавіяхім (Таварыства садзейнічання абароне і авіяцыйна-хімічнаму будаўніцтву СССР) і «Саюза ваяўнічых бязбожнікаў СССР» на імя клімавіцкага міліцыянера Сямёна Якаўлевіча Дрышчанкі. Білет Асаавіяхім, напрыклад, быў выдадзены яму ў Клімавічах у 1938 годзе.

Гэта імя было вядома членам гістарычнага клуба Магілёўскага інстытута МУС.

— Летась начальнік аддзела арганізацыі навуковай, міжнароднай і выдавецкай дзейнасці інстытута падпалкоўнік міліцыі Аляксей Цюцюнкоў знайшоў у архівах загад начальніка ўпраўлення рабоча-сялянскай міліцыі НКУС БССР капітана дзяржаўнай бяспекі Гардзеева ад 10 лютага 1940 года № 59 з прыкладзеным да яго спісам пераменнага складу Мінскай школы рабоча-сялянскай міліцыі — курсантаў двухгадовых курсаў 1940—1941 гадоў. У ім значыліся прозвішчы 151 чалавека. Сярод іх было імя і Сямёна Якаўлевіча. Па знойдзеных дакументах атрымалася даведацца, што ён нарадзіўся ў 1914 годзе. Знаходка пацвярджае звесткі, што асабовы склад школы міліцыі прымаў удзел у абароне Магілёва з 3 да 26 ліпеня 1941 года. А гэта адкрывае вялікія перспектывы ў нашай далейшай пошукавай дзейнасці, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Магілёўскага інстытута МУС Кірыл МАРЖАНАЎ.**

Нэлі ЗІГУЛЯ.

20 лет Белорусскому государственному институту метрологии

КРОК У БУДУЧЫНЮ

Новыя тэхналогіі патрабуюць звышдакладных вымярэнняў

2019 год юбілейны для беларускай метралогіі. 29 лютага 1924 года была створана Беларуская палата мер і вагаў. Але сёлета акрамя 95-годдзя метралагічнай службы краіны адзначаецца яшчэ адна не менш важная дата. Дваццаць гадоў таму пачаў дзейнічаць Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі. Стварэнне падобнай установы было выклікана неабходнасцю якаснага метралагічнага абслугоўвання патрэб эканомікі маладой незалежнай дзяржавы.

95 лет образования Белорусской палаты мер и весов 1924 – 2019 гг.

З лічбавым аўтакаліматарам працуе вядучы інжынер Мікалай ГАЛОЎЧЫК.

— Любая эканамічна развітая краіна павінна мець нацыянальны інстытут метралогіі, які забяспечвае ўзаемасувязь і перадачу адзінак велічынь рабочым сродкам вымярэння, падтрымлівае нацыянальную эталонную базу, забяспечвае зверку нацыянальнай эталоннай базы з эталонамі адзінак велічынь, якія выкарыстоўваюцца ў Міжнародным бюро мер і вагаў і нацыянальных метралагічных інстытутах вядучых замежных краін, — адзначае **дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Валерый ГУРЭВІЧ.**

Кіраўнік калектыву інстытута Валерый ГУРЭВІЧ.

Сёння гэтая вядучая ў краіне арганізацыя ў галіне метралогіі ахоплівае розныя сферы: заканадаўчую, тэарэтычную і прыкладную. Тут праводзяцца навукова-даследчыя работы, распрацоўваюцца і вырабляюцца эталоны і стандартныя ўзоры; выпрабоўваюцца, праходзяць метралагічную атэстацыю, паверку і каліброўку сродкі вымярэння; праводзяцца высокадакладныя вымярэнні і выпрабаванні прадукцыі; ствараюцца тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, даведачныя і метадычныя дапаможнікі; праводзіцца сертыфікацыя прадукцыі, паслуг, персаналу і сістэм менеджменту.

МЕТРАЛОГІЯ ВАКОЛ НАС

Кожны з нас выкарыстоўвае вынікі вымярэнняў. Мы сочым за станам здароўя, а без якасных даследаванняў не паставіць дакладнага дыягназу. У нашых кватэрах стаяць лічыльнікі вады, электраэнергіі, газу, і мы зацікаўлены ў тым, каб не пераплачваць за спажыванне рэсурсаў. Паверка і гэтых прыбораў, і многіх іншых, з дапамогай якіх праводзяцца вымярэнні, ажыццяўляецца метролагамі.

Любая прадукцыя, якая выпускаецца на рынак, павінна праходзіць кантроль як пры распрацоўцы, так і пры вытворчасці, да таго ж яна павінна быць сертыфікаваная. Натуральна, і тут не абысціся без сродкаў вымярэння. Бо ніякі тавар немагчыма прадаць, калі нельга пацвердзіць яго характарыстыкі.

— Метралогіія — гэта адзін з элементаў нацыянальнай бяспекі, — заўважае Валерый Гурэвіч. — Калі мы адказваем за вынікі вымярэнняў, значыць, упэўнены ў якасці і бяспецы прадукцыі і паслуг, правільнасці маніторынгу навакольнага асяроддзя, дакладнай пастаноўцы дыягназу, правільнасці функцыянавання сістэмы абароназдольнасці краіны і гэтак далей.

Да таго ж метралогія вучыць эканоміць рэсурсы і грошы. Напрыклад, важна, каб выкарыстоўваліся аднолькавыя сродкі і методыкі вымярэння, асабліва пры ўліку вялікага аб'ёму энергарэсурсаў (нафта, газ, электрычная энергія). Уявіце, што можа быць, калі розныя краіны тую ж нафту будуць вымяраць пры дапамозе розных сродкаў. Розніца тут можа «выцякаць» у вялікія сумы.

Метралогіія павінна падстройвацца пад імклівы рост лічбавай інтэлектуальнай вытворчасці. Так, пры пераходзе да «Індустрыі 4.0» узнікае неабходнасць у атрыманні вялізнай колькасці вымяральнай інфармацыі — каб сачыць за якасцю прадукцыі (і тут важны маніторынг сыравіны, паўфабрыкатаў, дэталяў, гатовых вырабаў), за вытворчымі працэсамі і абсталяваннем. Па сутнасці, у будучыні павінны з'явіцца цалкам аўтаматызаваныя прадпрыемствы. «Аўтаматычны кантроль усіх паказчыкаў дазваляе актыўна ўплываць на яго карэкціроўку, на прывядзенне ў адпаведнасць у выпадку адхілення ад тых патрабаванняў, якія былі закладзены ў дакументацыю. Уласна, і дакументацыя ў дадзеным выпадку будзе прадстаўляць сабой электроннае воблака, дзе ўсё будзе запісана ў адпаведных кодах, — расказвае Валерый Гурэвіч. — Адна з найважнейшых задач для нашага інстытута і іншых метралагічных арганізацый на найбліжэйшыя гады — стварэнне электроннага сертыфіката каліброўкі, яго ўкараненне для таго, каб дыстанцыйна перадаваць усю інфармацыю аб сродках вымярэння. Плюс, наколькі гэта будзе магчыма, правядзенне паверкі, каліброўкі дыстанцыйна, што павінна спрасціць работу прамысловым прадпрыемствам, павысіць дакладнасць вымярэнняў».

У аддзеле вымярэнняў электрычных велічынь. Вучоныя захавальнікі Ірына ФІЛІПЧЫК, Вадзім ПАПКО і яго намеснік Дзіяна СЕНЦЕМАВА праводзяць чарговыя доследы.

ЭТАЛОНЫ БЕЛАРУСІ

У Беларусі на сёння распрацаваны і эксплуатуюцца 56 нацыянальных эталонаў, 51 з іх знаходзіцца ў інстытуце метралогіі. Да таго ж на яго базе размешчаны 22 эталонныя ўстаноўкі найвышэйшай дакладнасці і больш за пяць тысяч адзінак эталоннага вымяральнага і выпрабавальнага абсталявання. Такая магутная эталонная база дазваляе ўдасканальваць работы ў галіне метралагічнага кантролю згодна з патрэбамі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, медыцыны, навукі і інш. Эталоны перадаюць значэнні даўжыні, масы, часу і частаты, тэмпературы, сілы святла, а таксама іншых адзінак у галіне фізіка-хімічных, аптычных, акустычных, электрычных, радыёэлектронных велічынь, вымярэння ціску і расходу, іанізаваных выпраменьванняў.

Намеснік начальніка аддзела геаметрычных велічынь Аліна ГАРАШКОВА.

У аддзеле вымярэнняў ціску і расходу. Вучоны захавальнік Андрэй КАЛОШЫН і яго намеснік Сяргей ФРАСІНЮК рыхтуюць абсталяванне.

Працягваецца работа па стварэнні новых лабараторый. Так, адна з навінак — лабараторыя эталонаў у нанаметровым дыяпазоне вымярэнняў — будзе садзейнічаць развіццю высокатэхналагічных галін прамысловасці. Ствараецца таксама лабараторыя вымярэнняў параметраў дысперсных асяродкаў.

Эталонная мера цвёрдасці паступае ў рабочую зону.

Сёння тэхналагічныя працэсы патрабуюць кантролю якасці паветра (напрыклад, у фармацэўтычнай вытворчасці, электроніке, медыцыне).

Наогул, у найбліжэйшы час нацыянальная база павінна прырасці яшчэ дзясяткам новых эталонаў. А да 2025 года ў Беларусі будзе функцыянаваць 80—90 дзяржаўных эталонаў.

Варта адзначыць такі важны момант, як міжнароднае прызнанне нашых эталонаў, якія праходзяць зверку з эталонамі іншых краін. Так, у базе Міжнароднага бюро мер і вагаў KCDB BIMP апублікавана 248 пазіцый аб найлепшых вымяральных магчымасцях (СМС-звестках) Беларусі. Інстытут экспартуе паслугі па каліброўцы, паверцы сродкаў вымярэння (сярод заказчыкаў — як краіны СНД, так і далёкага замежжа).

Карэспандэнты «Звязды» змаглі на ўласныя вочы ўбачыць некаторыя з нацыянальных эталонаў.

Эталоны — гэта складаныя тэхнічныя комплексы, стварэнне кожнага з іх доўжыцца каля трох гадоў. Вузлы і дэталі для іх па замовах метролагаў могуць вырабляцца на розных прадпрыемствах. Так, вядучы інжынер-метролаг Андрэй Калошын прадставіў нам эталон адзінак масавага і аб'ёмнага расходу вадкасці (вады): «Гэта штучны выраб, эталон ствараўся работнікамі інстытута, а таксама пры дапамозе другіх арганізацый Беларусі, асобныя вузлы замаўляліся за мяжой. Пад нашы патрэбы распрацоўвалася праграмнае забеспячэнне. Пры зверках эталон паказаў высокія вынікі. Тут павяраюцца высокадакладныя прыборы, якія выкарыстоўваюцца ў нафтавай прамысловасці, у харчовай вытворчасці, напрыклад на малочных і спіртзаводах».

РАЗВІТАННЕ З АРТЭФАКТАМ

У гэтым годзе дэвіз Сусветнага дня метралогіі — «Міжнародная сістэма адзінак. Фундаментальна лепш». З 20 мая ўступіла ў сілу рэзалюцыя, прынятая летась у Версалі на 26-й Генеральнай канферэнцыі мер і вагаў, дзе збіраліся метролагі каля ста краін, у тым ліку і Беларусі. У выніку шматгадовага актыўнага супрацоўніцтва нацыянальных метралагічных інстытутаў і Міжнароднага бюро мер і вагаў было прынята рэвалюцыйнае рашэнне — змяніць вызначэнні для асноўных адзінак Міжнароднай сістэмы адзінак (SI): кілаграма, ампера, кельвіна і моля.

— Мы нарэшце адмовіліся ад апошняга артэфакта. Так, да 20 мая 2019 года ім з'яўляўся кілаграм (плаціна-нікелівыя гіры, што захоўваліся ў горадзе Сеўр пад Парыжам і лічыліся сусветным эталонам). Цяпер сістэма адзінак будзе апісвацца з дапамогай фундаментальных канстант. Так, у новай сістэме маса будзе выражацца праз пастаянную Планка, — тлумачыць **дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Валерый ГУРЭВІЧ.**

Новы падыход палегчыць практычнае выкарыстанне сістэмы SI. Без надзейных і пастаянных вызначэнняў адзінак вымярэнняў сёння, пры імклівым развіцці тэхналогій, не абысціся. Пераход да лічбавай эканомікі прадугледжвае рост патрабаванняў да дакладнасці вымярэнняў, удасканалення паверачнай базы і метадаў кантролю.

Праўда, напачатку рэвалюцыйныя змены заўважаць толькі вузкія спецыялісты. Але ці адаб'юцца яны на жыцці звычайнага чалавека? У найбліжэйшай будучыні мы можам стаць сведкамі новых адкрыццяў. Перавызначаныя адзінкі вымярэнняў даюць новыя магчымасці для развіцця і ўкаранення інавацыйных рашэнняў і тэхналогій у навуцы і прамысловасці. Напрыклад, больш дакладнае вымярэнне тэмпературы дапаможа ўдасканаліць маніторынг і прагназаванне кліматычных змен. Без звышдакладных вымярэнняў немагчыма далейшае развіццё мабільнай сувязі і навігацыйных сістэм, інфармацыйных тэхналогій, прасоўванне так званых разумных гарадоў.

УНП 100055197

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Анастасія МІРОНЧЫК-ІВАНОВА:

«ВЕРУ Ў СЯБЕ І Ў СВАЕ СІЛЫ»

У спорце ёй двойчы прыходзілася пачынаць усё спачатку

Першы раз пасля нараджэння сына, а другі пасля дыскваліфікацыі, у якой Насця не разабралася і да гэтага часу. Перад Алімпійскімі гульнямі 2016 года ў Рыа яе адхілілі ад спаборніцтваў на два гады. Анастасія сцвярджае, што не прымала нічога забароненага, а гэтая сітуацыя подлая падстава зацікаўленых асоб. «Прыбіралі канкурэнтку, якая магла пазбавіць медаля іншую краіну», — кажа яна. Крыўдна да слёз было і таму, што перад Рыа-2016 беларуска была ў сваёй найлепшай форме і дакладна заваявала б там медаль. У дзень правядзення фіналу спаборніцтваў па скачках у даўжыню ў Бразіліі Мірончык-Іванова скакала на мінскім стадыёне РЦАП па лёгкай атлетыцы, на трыбунах з кветкамі сядзелі яе сябры. Там у сваёй найлепшай спробе Насця паляцела за сем метраў, гэты вынік на Алімпіядзе ў Рыа прынёс бы ёй «серабро»...

Адбыўшы дыскваліфікацыю, Анастасія знайшла ў сабе сілы і працягнула ісці да сваёй мары, побач з ёй трэнер Сяргей Іваноў, ён жа муж, і сын Глеб. У тым ліку дзякуючы іх падтрымцы спартсменка пасля складаных перыядаў у сваёй кар'еры змагла зноў паказаць медальны вынік і ў сакавіку на чэмпіянаце Еўропы ў закрытых памяшканнях у Глазга заваявала сярэбраную ўзнагароду. У сваім інтэрв'ю Анастасія расказала, чаго варта было яе вяртанне і як удаецца сумяшчаць вялікі спорт з роляй добрай маці і жонкі.

«Спадзяюся, усё атрымацца»

— Анастасія, ужо пачаўся летні сезон, якія старты будуць прыярытэтнымі для вас сёлета?

— Першы этап Брыльянтавай лігі ўжо стартаваў, але мы вырашылі яго прапусціць, не бачу сэнсу так рана пачынаць спаборніцкі сезон, бо чэмпіянат свету толькі ў кастрычніку, пік формы перанясём туды. У Брыльянтавай лізе пачну выступаць 6 чэрвеня, далей — Еўрапейскія гульні, матчавая сустрэча Еўропа — ЗША і чэмпіянат свету.

— Калі ацэньваць пройдзены зімовы сезон, задаволеныя сваімі вынікамі?

— Так, мы меркавалі, што я буду набліжацца да сямі метраў. Аднак я максімалістка, крытычна стаўлюся да сябе і сваіх скачкоў, таму ёсць да чаго імкнуцца. Па-першае, «серабро» зімовага чэмпіянату Еўропы пасля доўгага непрыемнага перапынку, гэта нядрэнны вынік, а па-другое, мне прыемна, што медаль парадаваў усіх маіх балельшчыкаў, тых людзей, якія ўкладвалі ў мяне сілы і верылі.

— Наколькі сур'ёзным стартам для вас стануць Еўрапейскія гульні?

— Кожнае спаборніцтва па-свойму сур'ёзнае, да ўсіх турніраў трэба падыходзіць адказна, асабліва калі яны праходзяць дома. Уся краіна прыйдзе за цябе хварэць, у тым ліку бацькі і сябры, не хочацца іх засмучаць. Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы адбудуцца ў новым фармаце, свае нюансы будуць і ў скачках у даўжыню.

А наогул, для нашай краіны гэта вельмі важныя спаборніцтвы, турнір вялікага маштабу, дзе трэба заявіць пра сябе, каб у свеце ведалі, што такое Беларусь, прыязджалі да нас на зборы і спаборніцтвы. Хай тут пабудуць турысты, спартсмены, паглядзяць, якія моцныя ў нас атлеты, добрыя ўмовы, якая прыгожая прырода, людзі.

— Што датычыцца чэмпіянату свету ў кастрычніку, якую адзнаку хацелася б там скарыць?

— Канкрэтных лічбаў не назаву, але, каб трапіць у тройку, трэба скакаць за сем метраў, гэта ўсе разумеюць. Зараз ідзе базавая падрыхтоўка, таму не хачу нічога планаваць. Зімовы сезон паказаў, што вынік 6,93 м мае на ўвазе далёкія скачкі летам, але як яно пойдзе... Веру ў сябе і ў свае сілы. Спадзяюся, усё атрымацца.

«Я адчула, што буду скакаць далёка»

— Ваш максімум зімой 6,93 м, летам 7,22 м. Калі пачыналі займацца скачкамі, марылі пра такія лічбы?

— Да гэтага часу памятаю свой першы старт, гэта быў юнацкі чэмпіянат свету ў Афрыцы, у Маракешы. Трэба было выканаць кваліфікацыйны адбор, дзе я скокнула 6,20 м і стала на гэтым чэмпіянаце восьмай. Потым удзельнічала ў розных матчавых сустрэчах, недзе перамагала, але калі шчыра, пра тое, ці змагу скокнуць 7 м, тады нават не думала. Калі ў юніёрах перайшла да Юрыя Вікенцьевіча Маісевіча, пачалі сур'ёзна працаваць, ведалі, чаго мне не хапае, у чымсьці дадавалі. Больш дарослыя вынікі прыйшлі недзе ў момант пераходу з юніёраў у моладзь, я адчула, што буду скакаць далёка.

— Ваш тата настаўнік фізкультуры, ён адыграў важную ролю ў станаўленні Анастасіі як лёгкаатлеткі?

— Ён сыграў вельмі важную ролю ў маім жыцці ў цэлым, не заўсёды бываюць такія бацькі. Займаўся мной з самага дзяцінства, мы хадзілі на лыжах, падцягваліся, выязджалі на роварах. Фізкультуру ён у мяне не вёў, а вось яго калега і сябар заўважыў ува мне даныя спрынтара і тое, што я далёка скачу, вырашыў запісаць у спартыўную школу. Я прыйшла на першую трэніроўку да Анатоля Анатолевіча Караневіча, спытала, колькі разоў на тыдзень трэба займацца. Ён кажа: «Ну, ты такая маленькая, табе разы тры хопіць». На што я адказала, што не згодная, што буду хадзіць шэсць разоў на тыдзень. Ён паглядзеў на мяне і сказаў: «Ты нам падыходзіш».

«Таго, што вытрымлівае муж, не вытрымаў бы больш ніхто»

— Псіхолагі кажуць, што дзяўчынкі выбіраюць у мужы мужчын, якія падобныя на бацькоў...

— Нават не ведаю, мой тата і муж зусім розныя. Падобныя толькі адным — стаўленнем да дзяцей. Мне здаецца, таго, што вытрымлівае мой муж, не вытрымаў бы больш ніхто. Я трэніруюся, ад'язджаю на спаборніцтвы, а ён увесь час знаходзіцца з сынам. Я ганаруся, што Глеб расце побач з бацькам, ведаю, што ён дапаможа яму ў любы момант.

— Вы пазнаёміліся з будучым мужам яшчэ да таго, як Сяргей пачаў вас трэніраваць?

— Так, мы разам вучыліся ў вучылішчы алімпійскага рэзерву, але адно з адным нават не размаўлялі. Ён скончыў, я працягнула вучыцца, але Сяргей неяк прыйшоў у госці да сваіх сяброў, хлопцы папрасілі мяне падысці, маўляў, са мной там хочуць пазнаёміцца. Мы разгаварыліся, я запрасіла Сяргея на гарбату і зразумела, што знайшла роднасную душу. Ён вельмі добры чалавек. Зараз не часта сустрэнеш мужчын, якія з клопатам і разуменнем ставяцца да жанчын. Калі б муж не быў спартсменам, ён ніколі не зразумеў бы маіх бясконцых збораў, стомленасці пасля трэніроўкі. Бывае, часам хочацца проста прылегчы, а ён памые посуд за мяне. За гэта яму вялікі дзякуй.

— Вы ўжо не раз адзначалі: у тым, што вас трэніруе муж, адны плюсы, але ці не выклікае гэта канфліктаў?

— Усё бывае, што хаваць, як і ў кожнай сям'і, у кожным калектыве, але трэба ўмець пераадольваць розныя моманты. Я вельмі запальчывы чалавек, магу пакрычаць на трэніроўцы, калі мне нешта не падабаецца, а Сяргей умее гэта згладзіць. Тады эмоцыі хутка згасаюць, я разумею, што трэба спыніцца і працаваць, ведаю, што ў першую чаргу гэта трэба мне.

— Сын і муж часта бываюць з вамі і на зборах, і на трэніроўках. Гэта аблягчае ролю жонкі і маці?

— Вядома, я называю Глеба сынам палка, таму што хлопцы з нашай групы дапамагаюць мужу глядзець за ім, калі я дзесьці занятая, раблю практыкаванне. Ладзяць яму нават «дзедаўшчыну», вучаць, як правільна паводзіць сябе па-мужчынску. Яму падабаецца і мне падабаецца, ён шмат ездзіць па свеце разам з намі, мне здаецца, гэта дае яму нашмат большае развіццё. Глеб вельмі актыўнае дзіця, у яго прыроджанае пачуццё гумару. Калі табе цяжка, а тут ён як «адпаліць» што-небудзь, пачынаеш усміхацца, ён часта разраджае абстаноўку. Але з іншага боку не проста, калі прыходзіш з трэніроўкі і адчуваеш сябе вельмі стомленай, усё баліць, не можаш нават устаць з ложка, каб пагуляць з ім. Было такое, што гуляла з дзіцем лежачы. Як у кожнай маці, сілы дзесьці знаходзяцца.

— Глеб ужо кажа пра тое, што хацеў бы стаць спартсменам?

— Вядома, кажа, што хоча быць, як мама, але ў яго пакуль мары ўразнабой, хочацца ўсяго. Пачалі мы з прэзідэнта, скончылі пілотам, што далей будзе — невядома. У любым выпадку мы будзем яму дапамагаць, а выбар за ім. Схільнасць да спорту ёсць, генетыка адыграла сваю ролю, ён далёка скача, хутка бегае, любіць рух, падцягваецца. Я яму кажу: «Глеб, давай мацуй мышцы, будзеш дзяўчатам паказваць». Ён качае — вельмі любіць жаночую ўвагу.

«Абавязак жанчыны — умець гатаваць, сачыць за сабой і выхоўваць дзяцей»

— Вам даводзілася з нуля вяртацца ў спорт двойчы: пасля двухгадовай дыскваліфікацыі і пасля родаў. Калі было складаней?

— Кожная сітуацыя па-свойму цяжкая. Пытанне аб тым, ці буду я вяртацца ў спорт, не стаяла, падчас цяжарнасці трэніравалася, не ўпускала ні хвіліны. Другі дом, у якім я нараджала, знаходзіцца насупраць майго дома, я пешшу са схваткамі туды прыйшла з велізарнай торбай, як на зборы. Нарадзіла і на чацвёрты дзень з каляскай пайшла хадзіць па парку хуткім крокам. Потым паволі стала трэніравацца. Пасля родаў цяжэй было фізічна ў тым сэнсе, што ў мазгах у мяне было адно — што я выйду і скокну сем метраў адразу, а мышцы не слухаліся. Працаваць над сабой, напэўна, усё ж такі цяжэй фізічна.

Сітуацыя з допінгам была цяжкай псіхалагічна, там трэба было нагнаць спаборніцкую дзейнасць з саперніцамі, гэта, у прынцыпе, хутчэй. Усе два гады дыскваліфікацыі мы ўсё роўна трэніраваліся, ладзілі свае спаборніцтвы. Сітуацыя для мяне непрыемная тым, што маёй віны няма, гэта жудасна, таму што я вельмі справядлівы чалавек. Я была ў шоку і да гэтага часу не ведаю, ці будзе ў мяне магчымасць даказаць сваю праўду пасля спорту. Ведаю, што гэта вельмі вялікія грошы.

Анастасія разам з мужам (адначасова трэнерам) і сынам.

— Вы ўжо адпусцілі гэтую сітуацыю?

— Вядома, мы адразу яе спрабавалі адпусціць, я чалавек не схільны да таго, каб упадаць у дэпрэсію. Непрыемна, што нашых наймацнейшых спартсменаў (я ведаю, што не толькі мяне), выдаляюць.

— У вашай кар'еры яшчэ сустракаліся подласці або падставы?

— Не буду нікога вінаваціць, але было шмат чаго, напрыклад атручванне. Мне здаецца, гэта ўсюды ёсць, не толькі ў спорце. Асабліва жорсткая жаночая зайздрасць. Але я не разумею людзей, якія зайздросцяць, бо ўсяго можаш дасягнуць сам, вазьмі ўсё ў свае рукі і таксама скокні. Знайдзі ў сабе сілы стварыць тыя ж умовы, каб у цябе былі тыя ж грошы, вынікі і ўсё астатняе.

— Калі наймацнейшыя спартсменкі застаюцца ў сектары для медальных разборак, часта здаецца, што атмасфера там вельмі напружаная.

— Ідзе гульня нерваў. Ёсць такая спартсменка з Амерыкі Брытні Рыз, яна пачынае з выклікам жаваць жуйку ў сектары, гэта такія амерыканскія штучкі, мне здаецца. Але справа тут нават не ў тым, што хтосьці хоча зрабіць нешта дрэннае, дзяўчаты ў сектары, як актрысы, яны ўваходзяць у вобраз. На самай справе мы не жадаем адна адной зла, а наадварот, падтрымліваем, робім камплімenты.

— Дарэчы, скакухі заўсёды адрозніваюцца сваёй прыгажосцю і прывабнасцю.

— Фігура лепіцца гадамі, цяжкай працай над сваім целам. Вядома, мы стараемся сачыць за харчаваннем, есці правільна, але, напрыклад, у выхадны можам схадзіць у «Макдональдс», не лічу, што, раз у месяц гэта шкодна, на трэніроўках усё згарыць. Напэўна, на падсвядомасці ў жанчын запісана, што, калі выходзіш на вялікую арэну, цябе здымаюць буйным планам, трэба быць прыгожай, вылучацца, таму і да старту большасць дзяўчат робіць макіяж. Абавязак жанчыны — умець гатаваць, сачыць за сабой і выхоўваць дзяцей.

— Дзе чэрпаеце сілы, калі стамляецеся і эмацыянальна і фізічна?

— Мы вельмі любім прыроду, асабліва нашу, беларускую. Па дарозе ў Слуцк, мой родны горад, ёсць вельмі прыгожыя возера і лес, набіраемся сіл там, ходзім з сябрамі на шашлыкі, з дзіцем у забаўляльны цэнтр.

— Часта бываеце ў родным Слуцку?

— На жаль, не, ад сілы раз у месяц, а то і радзей.

— Вы змагаецеся, каб у родным горадзе з'явіўся лёгкаатлетычны стадыён?..

— Так, і ўжо ёсць вынік. 90 працэнтаў, што ён там з'явіцца, хоць бы дарожкі з пакрыццём для дзяцей. Горад вялікі, быў перыяд, калі мы там трэніраваліся, дзеці цягнуліся да нас, бегалі з намі размінку, і ведаеце, там вельмі шмат талентаў, але няма ўмоў. Не хацелася б, каб дзеці ў такім узросце займаліся незразумела чым, лепш нехай ідуць у спорт, тым больш лёгкая атлетыка ў нас бясплатная. Для мяне гэтая ініцыятыва важная, таму што хачу, каб менавіта са Слуцка прыходзілі спартсмены і дамагаліся выніку. Там працуе мой тата, мой першы трэнер, ён адбірае дзяцей майму мужу, добра, каб сфарміравалася такая сістэма.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПОКУПАЙ БАТОНЧИКИ И ВЫИГРЫВАЙ ПРИЗЫ»

Настоящие правила проведения Рекламной игры **«Покупай баточники и выигрывай призы»** (далее – Правила), направленной на стимулирование реализации продукции, производимой под товарными знаками «Snickers», «Twix», «Bounty», «Milky Way», «Mars», указанной в п. 1.7 Правил, разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры **«Покупай баточники и выигрывай призы»** (далее – Рекламная игра).

1. Общие положения:

1.1. **Организатор Рекламной игры:** белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью (далее – «Организатор») с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП101132766. Электронный адрес: office@primary-jwt.by.

Заинтересованное лицо Рекламной игры: ТОО «Progression CA» (Республика Казахстан, БИН 080140009635) с местом нахождения по адресу: 050044, Республика Казахстан, Медеуский р-н, г. Алматы, ул. Сызганова, д. 1.

1.2. **Наименование Рекламной игры:** «Покупай батончики и выигрывай призы».

1.3. **Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь. Приобрести Игровой продукт можно в любых объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь, реализующих Игровой продукт.

1.4. **Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры:** с 22.05.2019 г. по 05.08.2019 г.

1.5. **Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры:** с 22 мая 2019 г. по 16 июля 2019 г. включительно.

1.6. **Состав комиссии** по проведению Рекламной игры (далее – комиссия)

Председатель комиссии:

• Куянцев Игорь Юрьевич, заместитель директора СП «ПРАЙМЭРИ» ООО.

Члены комиссии:

• Тимощенко Анна Сергеевна, ведущий специалист по связям с общественностью СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Зарецкий Вячеслав Сергеевич, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Абрамович Татьяна Владимировна, офис-менеджер СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Русак Руслан Иванович, специалист по медиапланированию Иностранного унитарного предприятие «Медиахауз».

1.7. **Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров, (по тексту Правил – Игровой продукт):

• Шоколадный батончик SNICKERS в упаковке массой нетто 50,5 грамма;
• Шоколадный батончик BOUNTY в упаковке массой нетто 55 грамм;
• Шоколадный батончик TWIX в упаковке массой нетто 55 грамм;
• Шоколадный батончик MARS в упаковке массой нетто 50 грамм;
• Шоколадный батончик MILKY WAY в упаковке массой нетто 26 грамм.

2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:

2.1. К участию в Рекламной игре допускаются достигшие возраста 14 лет физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь (имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь).

2.2. Участником Рекламной игры не может быть член комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

2.3. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

2.4. Для участия в Рекламной игре необходимо в период времени с 22 мая 2019 г. по 16 июля 2019 г. (включительно):

2.4.1. Приобрести в объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь два любых Игровых продукта, указанных в п. 1.7, в одном чеке и сохранить товарный чек.

2.4.2. Зарегистрировать чек на Сайте nebatonim.by путем указания в регистрационной форме необходимых данных: личного номера мобильного телефона оператора сотовой связи Республики Беларусь, услугами которого пользуется Участник (МТС, Velcom, Life:)), адреса электронной почты, имени, фамилии, отчества, адреса фактического проживания Участника и прикрепить фотографию чека, а также подтвердить свое согласие с настоящими Правилами путем проставления галочки в специальном окне Сайта. В случае успешной регистрации на странице Сайта выводится соответствующее сообщение.

2.4.3. Выбрать по своему усмотрению один из нижеперечисленных Главных призов, в розыгрыше которого Участник будет участвовать. При определении Главного приза Участник автоматически попадает в розыгрыш соответствующих Еженедельных призов:

Таблица 1.

№	Наименование Главных призов	Наименование Еженедельных призов
1	**Главный приз SNICKERS:** INMOTION V8 – МОНОКОЛЕСО, мощность двигателя 800W, аккумулятор 480 WH, Китай	Шоколадный батончик SNICKERS с жареным арахисом, карамелью и нугой, покрытый молочным шоколадом, 50,5 грамма, 48 штук в упаковке. Далее — Шоу-бокс Snickers
2	**Главный приз BOUNTY:** Фотоаппарат Fujifilm Instax SQUARE SQ20 (черный)	Конфета BOUNTY с нежной мякотью кокоса, покрытая молочным шоколадом, 55 граммов, 32 штуки в упаковке. Далее — Шоу-бокс Bounty
3	**Главный приз MARS:** Беспроводная и портативная колонка JBL Xtreme 2 (синий)	Шоколадный батончик MARS с нугой и карамелью, покрытый молочным шоколадом, 50 граммов, 36 штук в упаковке. Далее — Шоу-бокс Mars
4	**Главный приз MILKY WAY:** Электрический самокат Ninebot KickScooter ES2 v1.3 Grey	Шоколадный батончик MILKY WAY с суфле, покрытый молочным шоколадом, 26 граммов, 36 штук в упаковке. Далее — Шоу-бокс Milky Way
5	**Главный приз TWIX:** Квадрокоптер DJI Mavic Air Arctic White	Печенье песочное TWIX с карамелью, покрытое молочным шоколадом, 55 граммов, 40 штук в упаковке. Далее — Шоу-бокс Twix

2.4.4. Участники, **которые приобрели Игровой продукт в торговых сетях Гиппо и (или) Белмаркет** и выполнили иные условия участия в игре согласно п. 2.4.1. — 2.4.3 Правил принимают участие в розыгрыше Дополнительных призов, а именно Подарочных карт на приобретение 5 билетов на киносеансы Siver Screen, номиналом 50 белорусских рублей.

2.5. Один и тот же номер мобильного телефона и/или адрес электронной почты могут быть использованы для регистрации покупок только одного Участника.

2.6. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки Игрового продукта и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

3. Состав и размер призового фонда и источники его формирования:

призовой фонд Рекламной игры формируется Организатором в размере 11 002,68 (одиннадцать тысяч два) белорусских рублей и 68 копеек. Источником формирования призового фонда являются денежные средства и имущество Заинтересованного лица.

Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы (выигрыши), перечисленные ниже в Таблице № 2.

Таблица № 2.

	Наименование призов	Количество, шт.	Всего, бел. руб.
1	**Дополнительный приз:** подарочная карта номинальной стоимостью 50 белорусских рублей 00 копеек на право приобретения 5 билетов на киносеансы Silver Screen. Место расположения кинотеатров: г. Минск, ул. П. Мстиславца, 11, ТРЦ «Dana Mall»; г. Минск, ул. Бобруйская, 6, ТРЦ «Galileo»; г. Минск, пр-т Победителей, 84, ТРЦ «Arena City» сроком действия с 17.07.2019 по 14.10.2019	56	2 800,00
2	**Еженедельный приз:** шоколадный батончик SNICKERS с жареным арахисом, карамелью и нугой, покрытый молочным шоколадом, 50,5 грамма, 48 штук в упаковке. Далее – Шоу-бокс Snickers	16	488,45
3	**Еженедельный приз:** печенье песочное TWIX с карамелью, покрытое молочным шоколадом, 55 граммов, 40 штук в упаковке. Далее — Шоу-бокс Twix	16	401,28
4	**Еженедельный приз:** шоколадный батончик MILKY WAY с суфле, покрытый молочным шоколадом, 26 граммов, 36 штук в упаковке. Далее – Шоу-бокс Milky Way	16	207,36
5	**Еженедельный приз:** шоколадный батончик MARS с нугой и карамелью, покрытый молочным шоколадом, 50 грамм, 36 штук в упаковке. Далее – Шоу-бокс Mars	16	366,34
6	**Еженедельный приз:** конфета BOUNTY с нежной мякотью кокоса, покрытая молочным шоколадом, 55 грамм, 32 штуки в упаковке. Далее – Шоу-бокс Milky Way	16	325,63
7	**Главный приз SNICKERS:** INMOTION V8 – МОНОКОЛЕСО, мощность двигателя 800 W, аккумулятор 480 WH (стоимостью 2 030,00 белорусского рубля), а также денежные средства в сумме 283,76 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз SNICKERS	1	2313,76
8	**Главный приз BOUNTY:** фотоаппарат Fujifilm Instax SQUARE SQ20 (черный) (стоимостью 480,00 белорусского рубля), а также денежные средства в сумме 52,15 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз BOUNTY	1	532,15
9	**Главный приз MARS:** беспроводная и портативная колонка JBL Xtreme 2 (синий) (стоимостью 462,00 белорусского рубля), а также денежные средства в сумме 49,46 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз MARS	1	511,46
10	**Главный приз MILKY WAY:** электрический самокат Ninebot KickScooter ES2 v1.3 Grey (стоимостью 950,00 белорусского рубля), а также денежные средства в сумме 122,38 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз MILKY WAY	1	1072,38
11	**Главный приз TWIX:** квадрокоптер DJI Mavic Air Arctic White (стоимостью 1 743,00 белорусского рубля), а также денежные средства в сумме 240,87 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза. Далее – Главный приз TWIX	1	1 983,87

4. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:

4.1. Розыгрыши призов проводятся в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2.

4.2. Розыгрыши призов проводятся следующим образом:

4.2.1. Розыгрыш Дополнительных призов производится согласно Таблице 3 среди Участников, приобретших Игровой продукт в торговых сетях Гиппо и Белмаркет, и выполнивших иные условия участия в игре согласно п. 2.4 Правил, которые зарегистрировали чеки на Сайте в соответствии с Правилами в течение календарного дня (суток) соответствующего дате проведения розыгрыша (Таблица 3).

Таблица 3: розыгрыши Дополнительных призов:

№	Дата и время розыгрыша	В розыгрыше участвуют чеки, зарегистрированные на Сайте в течение календарного дня (суток)
1	23 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 22 мая по 23:59:59 22 мая 2019 г.
2	24 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 23 мая по 23:59:59 23 мая 2019 г.
3	27 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 24 мая по 23:59:59 24 мая 2019 г.
4	27 мая 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 25 мая по 23:59:59 25 мая 2019 г.
5	27 мая 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 26 мая по 23:59:59 26 мая 2019 г.
6	28 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 27 мая по 23:59:59 27 мая 2019 г.
7	29 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 28 мая по 23:59:59 28 мая 2019 г.
8	30 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 29 мая по 23:59:59 29 мая 2019 г.
9	31 мая 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 30 мая по 23:59:59 30 мая 2019 г.
10	3 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 31 мая по 23:59:59 31 мая 2019 г.
11	3 июня 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 1 июня по 23:59:59 1 июня 2019 г.
12	3 июня 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 2 июня по 23:59:59 2 июня 2019 г.
13	4 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 3 июня по 23:59:59 3 июня 2019 г.
14	5 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 4 июня по 23:59:59 4 июня 2019 г.
15	6 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 5 июня по 23:59:59 5 июня 2019 г.
16	7 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 6 июня по 23:59:59 6 июня 2019 г.
17	10 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 7 июня по 23:59:59 7 июня 2019 г.
18	10 июня 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 8 июня по 23:59:59 8 июня 2019 г.
19	10 июня 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 9 июня по 23:59:59 9 июня 2019 г.
20	11 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 10 июня по 23:59:59 10 июня 2019 г.
21	12 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 11 июня по 23:59:59 11 июня 2019 г.
22	13 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 12 июня по 23:59:59 12 июня 2019 г.
23	14 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 13 июня по 23:59:59 13 июня 2019 г.
24	17 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 14 июня по 23:59:59 14 июня 2019 г.
25	17 июня 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 15 июня по 23:59:59 15 июня 2019 г.
26	17 июня 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 16 июня по 23:59:59 16 июня 2019 г.
27	18 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 17 июня по 23:59:59 17 июня 2019 г.
28	19 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 18 июня по 23:59:59 18 июня 2019 г.
29	20 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 19 июня по 23:59:59 19 июня 2019 г.
30	21 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 20 июня по 23:59:59 20 июня 2019 г.
31	24 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 21 июня по 23:59:59 21 июня 2019 г.
32	24 июня 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 22 июня по 23:59:59 22 июня 2019 г.
33	24 июня 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 23 июня по 23:59:59 23 июня 2019 г.
34	25 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 24 июня по 23:59:59 24 июня 2019 г.
35	26 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 25 июня по 23:59:59 25 июня 2019 г.
36	27 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 26 июня по 23:59:59 26 июня 2019 г.
37	28 июня 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 27 июня по 23:59:59 27 июня 2019 г.
38	1 июля 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 28 июня по 23:59:59 28 июня 2019 г.
39	1 июля 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 29 июня по 23:59:59 29 июня 2019 г.
40	1 июля 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 30 июня по 23:59:59 30 июня 2019 г.
41	2 июля 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 1 июня по 23:59:59 1 июня 2019 г.
42	4 июля 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 2 июня по 23:59:59 2 июня 2019 г.
43	4 июля 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 3 июня по 23:59:59 3 июня 2019 г.
44	5 июля 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 4 июня по 23:59:59 4 июня 2019 г.
45	8 июля 2019 г. в 15:00	с 00:00:00 5 июня по 23:59:59 5 июня 2019 г.
46	8 июля 2019 г. в 15:10	с 00:00:00 6 июня по 23:59:59 6 июня 2019 г.
47	8 июля 2019 г. в 15:20	с 00:00:00 7 июня по 23:59:59 7 июня 2019 г.
